Літаратурная Беларусь

Выпуск №7 (155)
(ліпень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Колькі хочуць зарабляць пісьменнікі?

Ці ведаеце вы, што натхняе ці, наадварот, астуджвае творчы патэнцыял пісьменніка? Сёлета Каралеўскае літаратурнае таварыства Брытаніі зрабіла даследаванне пад назвай «Мой уласны пакой».



Ініцыятары даследавання натхніліся працай вядомай брытанскай пісьменніцы і літаратурнай крытыкесы Вірджыніі Вулф (Virginia Woolf; 1882–1941) «Свой пакой» (1929), дзе сцвярджаецца, што аўтар можа стаць сапраўды свабодным і здольным ствараць шэдэўры толькі тады, калі мае ўласны пакой і заробак, не меншы за 500 фунтаў, што на сёння адпавядае прыблізна 30 тысячам фунтаў на год (каля 3000 $ на месяц — Рэд.).

Вось літаратурнае таварыства і вырашыла даведацца, ці дасягнулі пісьменнікі Брытаніі гэтага ўзроўню і што ўвогуле трэба зрабіць для аўтара, каб яму камфортна працавалася.

Згаданае даследаванне базавалася на вывучэнні наступных аспектаў дабрабыту творцаў: патрэбы аўтараў, дапамога ад сваякоў і сяброў, асноўныя праблемы, якія даводзіцца вырашаць, а таксама тое, што прымушае аўтара рухацца далей і падтрымліваць пастаянную пісьменніцкую дзейнасць.

Для правядзення даследавання былі задзейнічаныя ажно 2166 аўтараў з усіх куткоў Брытаніі, прадстаўнікі мноства розных сацыяльных слаёў, расавых і гендарных груп.

Нягледзячы на тое, што Вірджынія Вулф была перакананая ў тым, што галоўным стымулам для паспяховай дзейнасці аўтара з'яўляецца фінансавы дабрабыт, новае даследаванне прадэманстравала, што эмацыйныя праблемы турбуюць сучасных аўтараў нашмат больш. У адказ на пытанне, які тып дапамогі неабходны, 80% брытанскіх пісьменнікаў адказалі, што ім неабходны ўласны пакой, 65% — узаемная падтрымка, 60% — эмацыйная падтрымка, і толькі 58% — фінансавая. Гэтыя лічбы дэманструюць, што пытанні асабістай прасторы і эмацыйнай бяспекі хвалююць пісьменнікаў больш за фінансавыя турботы.

Што да фінансаў, то даследаванне прадэманстравала: большая частка аўтараў не атрымлівае ў год тую суму грошай, якую Вірджынія Вулф лічыла аптымальнай. Толькі 5% пісьменнікаў у Брытаніі маюць больш за 30 тысяч фунтаў на год з пісьменніцкай дзейнасці, большасць, прыкладна 67%, зарабляе да 10 тысяч фунтаў.

Цікава, што толькі невялікая колькасць пісьменнікаў здольная пражыць на грошы, заробленыя з літаратуры. 10% рэспандэнтаў заявілі, што не маюць аніякай альтэрнатыўнай прафесійнай дзейнасці ці фінансавага падмурку, апроч творчасці. Больш чым палова адзначыла, што мае або падпрацоўку, або вольны графік (52%), а 20% аўтараў увогуле маюць пастаянную працу па-за літаратурнай дзейнасцю. Даследаванне паказала, што шанец пісьменнікаў зарабляць па 30 000 фунтаў на год у тры разы большы на іншай працы, чым літаратурная дзейнасць. 14% адсоткаў рэспандэнтаў зарабляе больш за гэтую суму на альтэрнатыўных працах.

Пісьменнікам вельмі важна ведаць, што плён іх дзейнасці прыносіць некаму карысць, а іх словы важныя для людзей, для грамадства

Прыналежнасць да той ці іншай сацыяльнай групы таксама мае ўплыў на паспяховасць пісьменніцкай дзейнасці. Напрыклад, 25% удзельнікаў апытання аднеслі сябе да рабочага класу, прадстаўнікі якога склалі толькі 11% катэгорыі людзей, якія зарабляюць больш за 30 000 фунтаў. Даследаванне таксама выявіла карэляцыю паміж расавай і гендарнай прыналежнасцю і заробкамі пісьменнікаў. 13% адсоткаў людзей ідэнтыфікавалі сябе як афрыканцы ці азіяты, але ў выніку склалі толькі 9% групы самых заможных пісьменнікаў.

Цікавая дынаміка была заўважаная і з уплывам полу на фінансавае становішча. 72% удзельнікаў апытання былі жанчынамі, якія склалі 57% самых высокааплачваных пісьменнікаў. Адпаведна, мужчыны складалі прыблізна 25% рэспандэнтаў, але, тым не менш, яны складаюць 41% пісьменнікаў, якія атрымліваюць найбольшыя ганарары. Лічбы дэманструюць, што ў Злучаным Каралеўстве людзі еўрапейскай расы і высокага сацыяльнага статусу маюць большы шанец на паспяховую аўтарскую дзейнасць.

Самымі вялікімі праблемамі для пісьменнікаў у пачатку кар'еры з'яўляюцца недахоп грошай, а таксама адсутнасць веры ў сябе і свае сілы, няведанне магчымых механізмаў дапамогі. 68% літаратараў лічаць галоўнай праблемай на шляху да пастаяннай дзейнасці фінансавыя цяжкасці. «Я пішу пастаянна, але мая жонка мае добрую працу — інакш я б не змог падтрымліваць сваю сям'ю адзін», — прызнаўся адзін з пісьменнікаў. 67% творцаў перакананыя, што адсутнасць часу — іх галоўны бар'ер у дасягненні поспеху: «З улікам таго, колькі часу забірае мая асноўная праца, я магу пісаць толькі па адным-два радкі ў дзень».

Можна зрабіць выснову, што фінансавыя цяжкасці і адсутнасць часу — гэта цесна звязаныя праблемы, якія турбуюць сучасных пісьменнікаў.

Адсутнасць веры ў сябе стала праблемай для 54% апытаных. Шмат хто з аўтараў заўважыў, што яны часта чуюць каментары ў свой бок, што ім не варта пісаць зусім, — своеасаблівы сацыяльны ціск, які прымушае людзей думаць, што яны не могуць стаць паспяховымі. «Я адчуваў, што такія людзі, як я, ніколі не становяцца пісьменнікамі», — сказаў адзін з рэспандэнтаў.

Як высветлілася, сувязь з расавай і гендарнай групай таксама ўплывае на тое, якія праблемы маладыя аўтары хутчэй за ўсё сустрэнуць на сваім шляху. Напрыклад, праблема з адсутнасцю веры ў сябе больш праяўляецца сярод жанчын (50%, у мужчын — 39%), а таксама ў людзей нееўрапейскага паходжання — 76%. Важным аспектам з'яўляецца і тое, што існуюць іншыя фактары, якія могуць значна пагоршыць ацэнку свайго патэнцыялу. Напрыклад, 74% аўтараў з цяжкімі захворваннямі выказалі адсутнасць упэўненасці ў параўнанні з 69% у здаровых аўтараў.

Але самым цікавым кірункам даследавання быў аналіз таго, якім чынам аўтары здольныя, нягледзячы ні на што, працягваць сваю дзейнасць і адчуваць, што іх праца патрэбная. Пасля дыскусій з апытанымі высветлілася, што пісьменнікам вельмі важна ведаць, што плён іх дзейнасці прыносіць некаму карысць, а іх словы важныя для людзей, для грамадства.

Таксама варта адзначыць ролю сям'і ў поспеху аўтара. Калі творца атрымлівае дастаткова ўвагі і ўпэўненасці ад сяброў і сваякоў, гэта дапамагае яму ўсвядоміць сваю важную ролю і працягваць пісьменніцкую дзейнасць.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што фінансавыя цяжкасці з'яўляюцца хутчэй бар'ерам для пачатку літаратурнай дзейнасці, у той час як эмацыйныя канфлікты могуць стаць бар'ерам для працягу пісьменніцкай працы. Большая частка аўтараў жыве, маючы другую працу апроч літаратурнай, і ім вельмі важна ведаць, што іх высілкі і ахвяры нечага вартыя.

Падрыхтаваў Павел Макоўскі
паводле rsliterature.org

Новы том Васіля Быкава

Васіль Быкаў. Поўны збор твораў у 14 т. — Мінск: Кнігазбор, 2019. — Т. 10, кн. 2 : Артыкулы, эсэ, прадмовы, выступленні, інтэрв'ю, гутаркі, калектыўныя творы (1981-1990). — 640 с.



Нагадаем, што першы ў гісторыі Поўны збор твораў Васіля Быкава ў 14-ці тамах запачаткаваны ў 2005 годзе Саюзам беларускіх пісьменнікаў пры ўдзеле Грамадзянскай ініцыятывы «Агульнанацыянальны рух Воля народа», расійскага выдавецтва «Время», пазней — беларускага выдавецтва «Кнігазбор». На сайце СБП можна свабодна спампаваць усе раней выдадзеныя тамы гэтага Збору ў фармаце .ePub.

Другую кнігу дзясятага тома склала публіцыстычная і літаратурна-крытычная спадчына Васіля Быкава 1981–1990 гадоў: артыкулы, эсэ, прадмовы, выступленні, інтэрв'ю, гутаркі і калектыўныя творы.

Новае выданне спадчыны Васіля Быкава можна набыць онлайн з дастаўкай праз інтэрнэт-краму «KNIHI.BY», а таксама ў кнігарнях «Акадэмкніга» і «Цэнтральная кнігарня».

«Гэтым людзям вельмі патрэбная камунікацыя»

— У нас не такі тэатр, дзе варта сядзець ціха і толькі слухаць, — тлумачыць Вераніка Фаміна, адна з заснавальніц лямцавай батлейкі.



Батлейка завітала ў аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў ТЦСАН Першамайскага раёна Мінска, дзе прэзентавала «Суперкнігу пра Біла з Болаю».

Першую кнігу пра Біла і Болу Гуніла Бэргстрэм напісала яшчэ ў канцы 70-х. Па сюжэце ў звычайнай шведскай сям'і нараджаецца дзяўчынка, што робіць абсалютна шчаслівымі ўсіх яе родзічаў. Але да пэўнага моманту. Тры гады дзіця не размаўляе. Пасля доўгіх абследаванняў высвятляецца, што Бола — дзіця асаблівае.

Кніга была напісаная пасля таго, як у сям'і самой Бэргстрэм нарадзілася асаблівая дзяўчынка. Праз год пасля выхаду першай кнігі спадарыня Бэргстрэм напісала працяг, а праз дваццаць гадоў абедзве кнігі трапілі пад адну вокладку: «Суперкніга пра Біла з Болаю: Біл разумны, Бола вясёлая», якая і была перакладзеная на беларускую мову Андрэем Хадановічам паводле падрадкоўніка Надзеі Кандрусевіч і Алесі Башарымавай.

— Для людзей, якія бавяць час у дзённым стацыянары нашага аддзялення, такія сустрэчы надзвычай важныя, — адзначыла загадчыца аддзялення спадарыня Матлах. — Людзям, якія прыходзяць да нас, трэба як мага болей стасавацца з іншымі людзьмі, таму мы імкнёмся ўвесь час запрашаць з імпрэзамі артыстаў з Інстытута культуры, з Чырвонага Крыжа. Вось і кампанія «Будзьма беларусамі» завітвае да нас не ўпершыню.

Людзі, што знаходзяцца ў стацыянары, успрымаюць лямцавую батлейку «на ўра».

Як заўсёды ў канцы спектакля батлейкі, гледачоў просяць адказаць на пытанне, сумная ці вясёлая гісторыя Біла і Болы. Гледачы пагаджаюцца з тым, што сумная і вясёлая адначасова. А пасля артысты прапануюць усім абняцца, што чакана выклікае вялікую весялосць і паказвае, што «іншасць» — гэта не страшна, нават калі яна не кніжная, а рэальная.

Мікалай Левертаў, budzma.by

Сіло для «часціцы бога»

У гэтым тэксце не будзе цытат, разбору «мастацкіх сродкаў» ды іншых атрыбутаў рэцэнзіі. Таму што гэта не рэцэнзія. Гэта канстатацыя выключнасці таго, што стварыў Ілля Сін.

Аяшчэ таму, што прэпарацыя матылька тлумачыць яго будову, забіваючы. А я хачу распавесці пра палёт.

Пісьменнікі, а перад імі — воінства бардаў, друідаў ды іншых адвеку біліся над адной звышзадачай: узнавіць жыццё. Зразумець свет, яго законы, а потым — стварыць свой. Дэміургі і сізіфы адначасова.

Як у матэрыяльнай мадэлі Сусвету існуе базон Хігса, «часціца бога», так і ў мастацтве ёсць няўлоўная часціца, без якой — ніяк, а ўхапіць — немагчыма (асабліва сачком літаратуразнаўства). Адзінае, што застаецца — адчуваць.

Прысутнасць гэтай часціцы змяняе ўсё. Нагрувашчванні слоў робіцца жывым творам. Гэты твор дыхае, пульсуе, змяняе светапачуванне чытача.

«Libido» Іллі Сіна — якраз такі твор.

Любы матэрыял, які выкарыстоўвае мастак, — толькі сродак стварэння абалонкі для ўнутранага агню. Не больш. Геніяльнасць Ван Гога не ў тым, як ён кладзе фарбы. А ў тым, што пакладзеныя фарбы пакінулі па сабе, што паміж імі. Не ў саміх словах, напісаных Вірджыніяй Вулф, але ў той прасторы, якую яны стварылі. Не ў нотах, якіх усяго сем штук, але ў канструкцыі, якую яны будуюць, каб зафіксаваць стан, эмоцыю, libido.

Спрабуючы знайсці для сябе адказ датычна таго, што такое мастацтва, я прыйшла да метафары з гаршкамі. Калі чалавек адкрыў для сябе агонь (libido, сіла мастацтва — называйце як хочаце), ён задаўся мэтай захаваць яго. Ён зляпіў гаршок.

Іншыя людзі сталі рабіць тое ж. Каб захаваць і перадаць агонь, яны ляпілі гаршкі, і справа гэтая стала абрастаць рознага кшталту ўскладненнямі. Гаршкі займелі мноства відаў, канфігурацый і калібраў (жанры); іх сталі ўпрыгожваць арнаментамі, малюнкамі, фарбаваць ва ўсе колеры вясёлкі (стылі); іх ляпілі з розных відаў гліны ды іншых матэрыялаў (мовы). Дайшло да таго, што гаршкамі сталі мерацца як паказальнікамі ўмельства. Спаборнічалі ў колькасці і вынаходлівасці.

І ў нейкі момант забыліся, што галоўнае — агонь, а не гліняная чарэп'е.

«Libido» — вяртанне таго самага агню.

У працяг метафары: некаторыя з апошніх водгукаў на кнігу Іллі Сіна бачацца мне гарачымі, безумоўна шчырымі, але бессэнсоўнымі па сваёй сутнасці развагамі гаршэчнікаў.

Назва кнігі — гульня вышэйшага парадку. Яна не толькі азначае змест твора — жыццё, разбітае на кропкі быцця. Застылае ў часавых адрэзках, як жамяра ў бурштыне. Сам твор і ёсць увасабленне libido.

Словы «жыццё» і «застылае» кепска між сабой стасуюцца, гэта праўда. Але дакладнае апісанне паасобных момантаў, станаў герояў, іх грубых ці вострых рэплік, звыклых прадметаў — найлепшы метад, які толькі мог абраць аўтар. Узяць кіно: гэта рух, аднак створаны ён шэрагам застылых, «мёртвых» карцінак-кадраў.

У аснове кнігі — жыццяпіс Марыі, былой порнаакторкі. Гандаль целам пры жывой душы прыводзіць да таго, што абясцэньваецца не толькі ўласнае Я, але ўвогуле — матэрыяльнасць свету. Закон аб усепаражным святле і справядлівасці адпрэчаны. Калі мажліва такое, а неба на зямлю не падае, у чым праўда? Як жыць?

А праўда ў самім жыцці...

Словы ў тэксце Сіна працуюць як кропкі каардынатаў: чытаць трэба не іх, а прастору, якую яны акрэсліваюць. Гэта літаратура самага высокага кшталту: яна не проста апісвае жыццё, але мадэлюе яго. Якім чынам аўтар дасягнуў такога эфекту, я не ведаю. Я не ўпэўненая нават, што ён разумее, наколькі важную рэч стварыў.

Казалі, што першакрыніцай для гісторыі Марыі стала «Жыціе Марыі Егіпецкай». Аўтар хацеў стварыць своеасаблівы «рэмейк» пісання. Марыя Егіпецкая — хрысціянская святая, заступніца жанчын, якія каюцца, а шырэй — усіх, хто дасягнуў дна і цяпер хоча ад яго адштурхнуцца.

Але ўсё гэта аказалася няважным. То бок, гэта мела значэнне напачатку, калі твор толькі задумваўся, бо давала аўтару першасны алгартым для дзеяння. Інструкцыю лепкі гаршка. Але вынік аказаўся больш важным за схему. Калі б Ілля Сін адкінуў першакрыніцу, не стаў пісаць заключны раздзел з выкупленнем Марыяй грахоў (перанараджэннем) і «Малітву...» (якая, у прынцыпе, вытлумачае ўсю кнігу, з'яўляецца сцісліым ідэйным пераказам у паэтычнай форме) — дык вось, калі б нічога гэтага не было, а засталіся толькі блуканні Марыі па мёртвым горадзе і сцэнкі з жыццяў суседзяў-самнамбулаў, мастацтва нікуды б не знікла.

Прызнацца, «Малітва...» мяне нават засмуціла. Так, трошачку. Як ключык да куфра, які ты мог і хацеў адкрыць без ключа.

Чаму Ілля Сін абраў хрысціянскі канцэпт для вырашэння пытання чалавечага быцця? Бо гэта светапогляд аўтара.

Чаму звярнуўся да вобразу грэшнай Марыі? Вось тут цікавей. Як казаў Флабэр, «мадам Бавары — гэта я». Не ў тым сэнсе, што грэшніца Марыя — Ілля Сін. Архетыповы вобраз выкуплення граху бачыцца мне адным з прачытанняў анталагічнай праблемы: барацьба матэрыяльнага і духоўнага. Плоцевасць для чалавека — рэальная, яе, груба кажучы, можна памацаць. Але яна мае заканчэнне, то бок гэта рэч апрыёры мёртвая.

Калі так, што трымае прадметы, арганізмы, стыхіі разам? Што не дазваляе сусвету скаціцца да незваротнай энтрапіі? Ёсць невядомая сіла, вышэйшы закон быцця, які трымае раўнавагу. Нехта шукае для яе азначэнне і вытлумачэнне ў рэлігіі. Хрысціянства — толькі адзін з «метадаў» прачытання.

Выкупленне граху ў такім ключы — гэта надзея цела на жыццё ў новым выглядзе, па-за матэрыяй. Марыя адчувае гэтую магчымасць; яна дайшла да разумення ілюзорнасці матэрыі, шукае выйсця на іншы ўзровень. Аддадзенае на здзек цела абвострыла канфлікт, стала каталізатарам. Вобраз Іншага — гэта зусім не чаканне нейкага там рамантычнага каханка; гэта прага дапамогі, чаканне збавіцеля.

Сін, апісваючы мярцвяцкую атмасферу безыменнага, бясконца існага і паўсюднага топасу, здолеў ухапіць гучанне гэтай безыменнай сілы. Яго тэкст спрацаваў як сіло для той самай «часціцы бога».

І немінуча ўзнікае складанасць: для таго, каб адчуць гэта (аднаго інтэлекту мала, адкуль, уласна, і ўсе канфлікты, датычныя мастацтва), трэба быць «трошку Марыяй». Трэба быць на адной хвалі з аўтарам. Хоць раз пабываць у памежным стане, пасля якога матэрыяльны свет бачыцца табе дэкарацыяй. (Пра дэкарацыі, дарэчы, Ілля Сін таксама не раз згадвае).

Гэтая кніга патрабуе часу. Адмысловых наладаў свядомасці і слыху, чуйнага да высокай, пранізлівай частаты. Крытык, у практыцы якога здараліся такая кніга, можа лічыцца шчаслівым.

Наста Грышчук

Пацеркі даверу

Святлана Воронік. Пацеркі даверу: вершы. — Мінск: Кнігазбор, 2019. — 112 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 118).

Упаэтычным зборніку Святланы Воронік — асэнсаванне навакольнага свету, прыроды, чалавека ў кантэксце зямнога быцця і Космасу. Гэта шлях чуйнай душы праз спазнанне болю, расчараванняў — да светласці і гармоніі. Пачуццё і думка выяўляюцца ў лаканічных формах, якія даюць чытачу прастору для роздуму, для расчытвання падтэксту і пранікнення ў таямніцы паэтычнага слова...


Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

Дубатоўка па-ўкраінску

Угорадзе Белая Царква Кіеўскай вобласці адбылася прэзентацыя кнігі «Чужы» гарадзенскага пісьменніка, кіраўніка Гарадзенскага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Валянціна Дубатоўкі.

Кніга сёлета выйшла ва Украіне ў перакладзе на ўкраінскую мову Наталлі Куліш. У ёй распавядаецца пра каханне заходнебеларускага юнака да дзяўчыны. Каханне гэта было няўдалым, бо часы былі самыя трагічныя ў сучаснай беларускай гісторыі. Пра ўсё гэта і распавядаецца ў кнізе Валянціна Дубатоўкі «Чужы». Цяпер з ёй знаёміцца ўкраінскія чытачы. Кнігу ў Белай Царкве прэзентавала ўкраінская пісьменніца Марына Варыч.

Барыс Баль, racyja.com



Кругі на вадзе



Людміла АНДЗІЛЕЎКА

Пінгвін

Жывот выпірае на ўсе восем месяцаў — рыхтык пінгвін! Дзіця, вагой у чатыры з паловай кілі, — не схаваеш, трэба б скінуць лішак вагі — патрабуе доктар, ды так хочацца салёнага! Як вынік — піць, потым — салодкага, кісленькім шліфанеш, яшчэ кіля на вагах.

«Кафэ-бар», — чытаю, аж заказытала пад лыжачкай!

У Наваполацку, калі займаліся ў музычнай вучэльні, бегалі пасля стыпендыі ў бліжні павільёнчык «Марозка» ці дальняе кафэ «Пралеска» выпіць малочнага кактэйлю «Пінгвін». На абедах зэканоміш — але купіш некалькі порцый паспытаць рознага гатунку. Гадоў пяць не сустракала любімы ласунак, і вось прыехала ў сталіцу павышаць кваліфікацыю! Як убачыла «Кафэ-бар» — не адышла ад дзвярэй, дачакалася адкрыцця і прамым ходам да стойкі.

— Сядайце за столік, — ласкава прапанавала жанчына. — Да вас падыдзе афіцыянт. Там ляжыць карта.

Ну, канечне, — сталіца! Я села, глянула ў дабротна выкананае меню — цэны ўразілі, але не спынілі. Падышла прыемная дзяўчына.

— Што жадаеце?

— Два кактэйлі па дзвесце грамаў.

Яна ўтаропілася ў мой жывот і ледзь знайшла словы.

— А вам можна?

— Напэўна — не, ды вельмі хочацца.

— А не многа будзе?

— Ой! Я ў свой час і па чатыры адразу выпівала, — супакоіла я афіцыянтку.

— Гэта вельмі вялікія порцыі — так не заказваюць у нас.

Якая дзіўная! Кожны гандляр імкнецца прадаць, а гэтая — адгаварыць.

— Калі ласка, два па дзвесце, — настойваю.

— Гэта вельмі дорага каштуе, — не супынялася афіцыянтка.

— У мяне ёсць грошы.

— Добра, я прынясу вам, але спачатку толькі адну порцыю.

Калі я атрымала свой заказ, зразумела, чаму так культурна і дальнабачна адразу разлічыла мяне афіцыянтка за першую порцыю і схавалася з вачэй у патаемную камору... З першага глытка мае вочы скруціліся з арбіт. Гэта быў моцны алкагольны кактэйль... Ад сораму я хуценька зграблася з кафэ, пакінуўшы на стале дзвесце грамаў «Пінгвіна» за палову свайго заробку. А каб мне прынеслі два, як прасіла? Смешная дзяўчынка, яна пасаромелася адкрыта папярэдзіць, думала, а раптам я хворая на гарэлку.

Дэбіл на экскурсіі

Дзвінскую эксперыментальную базу інстытута леса, скарочана ДЭБІЛ, рэгулярна вывозілі на экскурсіі. Патрапіла і я праз мужа. Пасялілі групу разам, на падлозе, на матах спортзалы адной з акраінных Ленінградскіх школ. Мужчыны ноч — п'юць, дзень — п'юць. Аўтобус з нанятым экскурсаводам стабільна дастаўляе экскурсантаў да культурна-гістарычных кропак слаўнага горада, але выходзяць з аўтобуса толькі жанчыны, мужчыны працягваюць гуляць у карты між стаканамі.

Мана! Засталіся ж групавыя здымкі, зробленыя па замове у мясцовых фатографаў: у тры шнурочкі, хто — у прысядку, хто — стаіць... Сімпатычныя, маладыя. Вецер дзьме ў твары. Значыць, выходзілі з аўтобуса і мужчыны, не толькі да ветру.

Адна з жанчын, не знаёмая мне работніца вясковай філіі, узялася бадзёра і актыўна са мной сябраваць, ды яшчэ з правадырскімі замашкамі. Трымала ўвесь час у полі зроку, крочыла нага ў нагу, падавала каманды. Бедная кабета, не ведала, што «не на тую нарвалася», не знала майго непадуладнага характару, маёй нелюдзімасці. Я — воўк-адзіночка. Камандаваць мной не дадзена нікому. Самы жорсткі начальнік жыве ўва мне самой.

— Чаго ты стала? Няма там нічога цікавага. Ідзі сюды. Глядзі, якое дзіва!.. Хопіць спаць, пайшлі ва ўборну мыцца, зубы чысціць... Займай чаргу, я пабягу наглядаць, што прадаюць. Бяры па дзве порцыі марожанага — я сяду, пасцерагу столік...

— Пакіньце мяне. Я не люблю загадаў, — не сцярпела я нарэшце.

— Ненармальная! — абурылася «сяброўка», але адчапілася.

У тыя гады апельсіны былі дэфіцытным прадуктам. Асабліва правінцыялы, не прызвычаеныя да вольніцы, хто пакінуў дома малых дзяцей, марылі смачным гасцінцам адкупіцца за «бацькоўскую здраду». Мы з'ехалі аж ад траіх, так што пільней за іншых шукалі, дзе б купіць апельсіны. Ні ў цэнтры, ні на акраінах імі і не пахла. І раптам... запахла!

Былі ў Піцергофе, ішлі па гофе, і тут улоўліваю фантастычны водар! Апельсіны! Дзе?! Дрэвы, дрэвы, кусты, газоны, статуі, фантаны, лавачкі, альтанкі, зноў дрэвы, дрэвы, кусты... Я ішла па нюху, упоперак маршруту групы, голасна аб'явіўшы мэту свайго напрамку: «Апельсіны!». Адна пара кінулася за мной. Куды нос вядзе? Вось — летняе кафэ! А ў ім апельсіны! Нам шчодра аддалі апошні запас, па скрыні на плечы. Назад, у школу, група вярталася водным шляхам — кацерам. На «докераў» — да слёз смешных мужчын (самы высокі і самы малы ростам), згорбленых пад вагой скрынь, у порце здзіўлена паглядалі гараджане-мінакі. Культпаездка...

Кругі на вадзе

У раздзеле ГОСЦІ назойлівага сайта «АДНАКЛАСНІКІ» паглядаў на мяне з фота незнаёмы мурлаценькі дзядзька на фоне дагледжанай сядзібы: мальвы, ружы, сад, альтанка, ставок з рыбкамі, трактар, аўто... Дабрабыт у поўным наборы. Усё, што многім па справядлівасці здаецца сапраўдным рэальным шчасцем, чамусьці не выбраным мною ў гэтым зямным жыцці. Не пазнала я дзядзьку, а вось прозвішча, рэдкае, пакручастае спыніла: яго калісьці чула. Перабрала транзітнікаў класа, школы... Ва ўспамінах жыхароў роднага горада такога прозвішча не вялося. Інстытут? — Без зачэпкі. Работа? — Не! Дзе ж яно магло сустракацца?..

Самая мініяцюрная, мілавідная дзяўчынка групы першага курса музычнага вучылішча — Зарана, быццам дванаццацігадовае дзяўчо. Прыгожая, каб не гэтая недаспеласць кволенькай постаці. Быццам сарвалі кветку ў завязі, моцы хапіла распусціцца: паказаць сілу прыгажосці, водару — не. І ўсё ж невысокая постаць і адсутнасць зманлівых формаў не дабаўлялі характару Зараны і кроплі інфантыльнасці ці падабенства школьніцы. Не яркасць, не кідкасць выдзялялі дзюймовачку Зарану з дзявочага шэрагу студэнтак. Твар яе паланіў надзвычайнай жаноцкасцю. Лагодны погляд вялікіх блакітных вачэй апавіваў спакоем і спагадай, дарыў упэўненасць — у гэтай галоўцы не затрымаецца брудная думка альбо перастане такой звацца; гэтыя пяшчотныя вусны не здольныя прамовіць грубага слова, ружовыя шчокі з ямачкамі цёпла будуць усміхацца нават у самы цяжкі момант жыцця. Жаноцкасць ва ўсім: у паводзінах, гутарцы, хадзе, паставе. Пры тым сціпласць і ціхмянасць яе характару не перашкаджалі пры патрэбе абараніць праўду ад няпраўды. Так натуральна і бяскрыўдна прамаўляла Зарана словы нязгоды, быццам бег вясновага ручайка мімаходзь вызваляла ад парожакаў смецця.

Чарнявы мацак па мянушцы Докер, які паступіў у нафта-тэхнікум, здаецца, проста ад балды, — не збіраўся ён станавіцца нафтавіком, — увязаўся за каханай дзяўчынай: Зарана прыехала ў гэты горад вучыцца ў музычным вучылішчы. У першы ж тыдзень навучальнага года Докер заявіўся ў гуртжытло да хлопцаў яе групы з торбай бутэлек і здолеў за вечар з усімі дамовіцца, што ні адзін з іх не пасягне на Зарану. Бо тая ад трынаццаці сваіх гадоў належыла яму. Падзялілася з сяброўкай і Зора таямніцай скораспелага кахання. І павялося ў студэнцкім асяроддзі: хлопцы не без цікаўнасці, з захапленнем зырылі на смяшлівую, зорнавокую Зарану як на сястру.

Праз год Заранін Докер адбыў на вайсковую службу ў Германію. У ячэйцы насценнай фанернай скрынкі пры вахцёрцы ў фае гуртжытла, куды паштарка прыносіла пошту, пад першай літарай Заранінага прозвішча на працягу года штодзённа чакаў Зарану новы ліст ад салдата, а то і два. Танны канверцік без марак і ўпрыгожваючых экслібрысаў, коштам у капейку, а ў наборы — паўкапейкі, з дробным, роўным мужчынскім почыркам радаваў сваёй абавязковасцю і надзейнасцю не толькі вока і душу адрасаткі... Раптам майскімі днямі ячэйка апусцела.

Група змовілася блізкім летам, пасля заканчэння другога курса, паехаць у Крым на мора. Падрадзіліся ў тамашнім саўгасе збіраць таматы ў полі. Докер сваёй каханай вандроўку забараніў! Зарана не паслухала, эпісталярна паведаміла кавалеру, што ўсё-такі паедзе на поўдзень. Гэта маленькае выпакутаванае непаслушэнства прыдало Заране самапавагі і ўпэўненасці. Дзяўчына стала яшчэ прыгажэйшай: рысы яе твару набылі прыцягальную адметнасць. Ухажоры паўднёвыя і свойскія пчаліным роем віліся вакол Зоры.

Прыезджых хлопцаў мясцовыя білі. Дубасілі гасцей крымчане жорстка і бязлітасціва. Звычайна, у самы разгар бойкі хтосьці з «іх пераможцаў» узлятаў на другі паверх гуртжытла, нахаду кулаком выбіваў «апошнюю перашкоду» — драўляную плашку ніколі не зачыняных на ключ дзвярэй дзяўчачага пакоя, уторкваў у праём тупаватую, разгарачаную бойкай фізіяномію, аглядаў студэнтак, мігам крутануўшыся, адкрываў нагой дзверы і апынаўся ў праходзе цалкам, хапаў на рукі збянтэжаную Зарану, быццам ёй штосьці пагражае. Пад зайздраснымі позіркамі хлопцаў і дзяўчат выносіў яе на калідор. На тым канфлікт стухаў да наступнага разу. Здавалася, бойкі толькі дзеля таго і распачыналіся, каб «выратаваць» Зарану, хоць ні адзін з герояў так і не атрымаў прыхільнасці. Але і пра свайго Докера гаворак яна больш не вяла...

Лета прайшло без вестак ад салдата. Пачаўся трэці курс. Неяк сама сабой завялася ў Зараны звычка праходзіць паўз ячэйкі фанернай скрыні хуценька, без прыпынку. Яна не выдавала тварам ні роспачы, ні адчаю, заставалася па ранейшаму заўсёды з добрым настроі.

Кастрычніцкім суботнім вечарам, калі сямейныя Зараны зграбалі і палілі ў садзе сухое лісце, яна вынесла з дому ўвесісты цючок салдацкіх лістоў, акуратна перавязаны блакітнай стужкай, і, разгортваючы кожны канверт, стала кідаць у вогнішча павольна паасобку, нібы развітваючыся, чакаючы вызвалення: канверт, ліст, паштоўку — карцінкі непрыкрытага сэксу. Невядома навошта кожны раз Докер укладваў для сваёй юнай нявесты парнаграфічную картку...

Вось чыё прозвішча значылася пад фотакарткай мардаценькага дзядзькі ў маіх гасцях на сайце «АДНАКЛАСНІКІ»! Гэта Заранінага Докера так па сапраўднаму звалі. З чаго б гэта чалавек, зусім да мяне ніякага дачынення не меўшы, стаў цікавіцца мною?

Наступным днём мяне чакала на сайце звестка. Зарана паведамляла, што расшукала мяне са старонкі мужа, бо сваёй заводзіць не стала.

Так, так, яны пажаніліся ў самым канцы чацвёртага курса, калі Докер вярнуўся з арміі. Здымалі кватэру, але не прыжыліся ў горадзе, паехалі дамоў, дзе Зарану чакала родная музычная школа. І нават на адным з першых педагагічных семінараў, якія ладзілі пры Саюзе (потым сталі грошы на ўсім эканоміць) я неяк сустрэла Зарану. Яна, ужо крыху памажнелая, пакруглелая, але па ранейшаму смяшлівая, простая і мілая, жалілася на свайго тады ўжо мужа: «Ведаеш, даскакаўся. Лётаў-лётаў па танцульках і атрымаў! Адбілі ўсё, што ёсць. Ледзь вычухаўся ў рэанімацыі. Дужа хварэе». Яна прамаўляла словы як звычайнае, штодзённае, норму. Мне вельмі цяжка было зразумець такі лёгкі Зорын характар, я не ўмею глядзець на жыццё проста. У мяне ўсё складана, праз сетку прычынна-выніковых сувязяў, з каранямі і шлейфамі, з ланцугамі паслядоўнасці... Зайздрошчу Заране па ўсіх накірунках. Менавіта такой і трэба быць сапраўднай ЖАНЧЫНЕ.

Выходзіць, адумаўся Докер, узяўся за галаву, стаў фермерам, адбудаваў дом-палац. Выхавалі дзяцей.

Я разглядала фотаздымкі і ні на адным не адшукала Зараны. За час развітання мае аднакурснікі і аднакурсніцы разам са мной парабіліся непазнавальнымі, аднак не да такой жа ступені, каб зусім не пазнаць чалавека. Зараны на фота не было. Мая багатая фантазія пачала маляваць розныя варыянты развіцця жанчыны ў такіх умовах. Уяўляла гаспадынь падобных сядзіб: грубых, мажных, сквапных, самазадаволеных цётак з дадаткам індывідуальных рысаў. Унізвала пальцы Зоры залатымі пярсцёнкамі. Яны ў яе былі і ў юнацтве, ды ніколі не ўплывалі на душу і розум. Уяўляла ссохлую, змучаную работай, прыгнечаную мужам кабету, толькі што і здольную рыць гектары бульбы і буракоў. Двор трымаць у парадку, дом у чысціні — трэба быць прафесійнай домработніцай. Не... Гэта ўсё не Зарана. Я глядзела на фотаздымкі яе дачушак, рэдкаснай прыгажосці — абразкоў сапраўднай жаноцкасці (проста копіі колішняй юнай Зараны), і верыла: яна засталася такой жа прыгожай, проста не любіць фатаграфавацца, не любіць выстаўляць на паказ свае «фотасесіі».

Бедная кабета, не ведала, што «не на тую нарвалася», не знала майго непадуладнага характару, маёй нелюдзімасці. Я — воўк-адзіночка. Камандаваць мной не дадзена нікому. Самы жорсткі начальнік жыве ўва мне самой

Стома метала



Юрка ГОЛУБ

Безназоўнае

Заплаканы голас расы
Запросіны робіць за шыбай.
Адну з найвысокіх раслін
Схапіла праменне за шыю.

Пад вокнамі ходзіць раса,
Чапляе за боты пад плотам.
Тут поначы зорка расла,
Каб знікнуць у вечнасці потым.

Забудзьма пра ноч назаўжды.
Успомнім наўскід далягляды.
Віецца дарога, як дым,
І воку праз дым далягае.

Навошта аглоблі радкам:
Патрэба ў калёсах адпала.
Дзе рэчышча значыць рака,
Пасталі разгублена па́лі.

Узгорак.
Жаўрук.
І рыштож.
Плячо не даецца прыкла́ду.
З уласнай душою раство
Даводзім сумесна да ладу.

Пра талент

Ён з неба ласкаю надзелены
Па лужах шлэпаў басаноож.
І слова з крэменя з надзеяю
Красаў упарта дзень і ноч.
Зайздроснікі жадалі крэсіва
Сабе забавіць з-пад крыса.
Ды лёс у таленту не скрэсліў,
Бо злоснікам не ў зуб краса.

Спякота джгала невыносная,
А сцюжа кліпіла сустаў.
Ён галубам з вясны да восені
Услед захоплена свістаў.

Не скрухі сцежка пад'ярэмная
Яго да вольніцы вяла.
Там высілкі былі дарэмнымі
Вужа, Ваякі і Вала.

Ірдзеюць між радкоў праталіны.
Дзе эпас з коп'ямі і сталь.
Апекаваўся творца талентам
І помнікам над ім паўстаў.

Алене Таболіч, перакладчыцы кнігі «Срэбны дождж».

Вёска Горна. Не з завугolля
Зазірае сюды Шэкспір.
Замяніў валачобны голуб
Клічнік лозунгу «Мы — за мір!»

Кракатлівы прарок пагоркаў,
Пазначае Пярун абшар.
Згодай слова цябе агорне,
І ў нязгодзе з няздарам дар.

Дождж любові квітнее змалку.
Горыч страты расце з віны.
Над зямлёй, як абломкам смальты,
Беларусі жаўро звініць.

Пачатковае школы лямец.
Коска з кропкаю — матылёк.
Немагчыма радзіму пляміць
І не зблізку, і не здалёк.

Век пры веку стаяць братамі:
Не махае між іх бязмен?
Беларуска для ўсіх Брытаній —
Англічанка з тутэйшых сцен.

Нібы рыбка з вадой — з табою —
Мова, свой радавод падоўж.
Пераклады Алены Таболіч
Тут агучвае срэбны дождж.

Стома метала

У штопар шпурнуў самалёт
Вятрыска — на гала.
Дзе падаў, дыміла смалой...
Стома метала.

Да пірса дапоўз карабель,
А шлюпкі адсталі.
Аб дно субмарыны скрабе
Стома метала.

Жорны не круцяцца.
Млын.
Скобы вятруга зламала.
Мліва абмелена плынь.
Стома метала.

На корані крон і краін
Знямога крактала.
Сканала жалеза ў крыві —
Стома метала.

Хэй!

*Калі цябе страчае Візбу**
*І Домкыркана** чуцен звон.*
Тутэйшы «Хэй!» галоснай візай
Вітае беларускі лён.

Калі праз Балтыку з парома
Цябе заклічуць з шведкай швед,
Дык тое значыць: вам пароўну
Даліся сэрцы і сусвет.

* Горад на шведскім востраве Готланд.
** Сабор у Візбу.

Выснова

Нас жыццё за сабой вядзе.
Не дае апынуцца з краю.
Абыякіх чужой бядзе
Крывая сцежка карае.

Рэха

Рэха клікала Цімоха:
— Дзе ты, хлопча? Вох ды вох!
Як грыбок з густога моху,
Адгукайся:
— Ту —ут! —
Цімох.

Шпацыр па вуліцы Ліможа

Гродна і французкі Ліможж — гарады — пабрацімы. (Даведка.)

Не варта каралёў
І не эскорт анёлаў,
Ляцяць — крыло ў крыло —
Нармандыя і Нёман.

На плечы і балкон
Аблок спадаюць пёркі,
А раптам з тых бакоў,
Дзе Францыі пагоркі.

Дзе Гаўра маякі —
Ніяк не паражэнцы.
Дзе зналі, як макі,
І нашых ураджэнцаў.

І кожны з іх нырай
У той блакіт высокі,
Дзе, як казаў Рэнар,
Найпекныя аблокі.

Сінечы абажур —
То неба наша гожа.
«Дзень добры!» і «Банжур!»
На вуліцы Ліможа.

Летуценнік

Каб асвойтацца ў абдымках кроз,
Адпаведна рыхтаваў матывы.
Усчынаў дыету, бегаў крос:
Тое значыць, ніШчыў негатывы.

Шчаслівы вырай

Фелікс БАТОРЫН

***

Пераблыталіся вятры
У галінах старога саду,
І закручваюць віры
Палымянага лістападу.

Раздзімаюць яны падалы,
Крыссем лопаюць, быццам крыллем.
І сто тысяч вар'ятаў Далі
Да́лі жывапісам пакрылі.

І шырэе зямная шыр
У мінорна-барвянай гаме,
Як вялікі мыльны пухір,
Падтрыманы нябёс рукамі.

І ажно за краем зямлі,
За апошняй спіраллю віру,
Мы шукалі — і не знайшлі,
Дзе б мог быць нам шчаслівы вырай.

Пэўна, ў вырай не нам ляцець:
Нам застацца наканавана,
Дзе, разменяная на медзь,
Наша золата ўскарбавана.

***

Я шчыра за грамадства спажывання:
Нашто стварацъ, калі не спажываць?
Хай кожны вечар будзе плёнам рання,
А ранне будзе ўсім, як дабрадаць.

Хай на зямлі не застанецца злосці
І толькі творчым будзе неспакой,
Хай кожны існы радуе кагосьці
І радуецца радасці людской.

Хай стануць людзі сведкамі паўстання
Супольніцтва Майстроў і Маргарыт.
А хто жыве выключна спажываннем,
Не спажывец зусім, а паразіт.

***

Усіх кранаюць пэндзаль і струна.
Усіх раўняюць лазня і труна.
Ды я ад рання б мог да ночы мыцца,
Пасля чаго — ад цёмна да відна!

А трэцяй ночы

У павуцінні цюлю
Павук даспелай поўні.
Гардзіну мы адтулім —
І замаўчым раптоўна.

Без за́смужы ваконнай,
Без пожадзі гаморнай
Мы з вышыні балконнай
Убачым горад зорны.

Між каляровых зорак
Рэклам і светлафораў
Начны салодкі морак
Смыленне студзіць зморы.

Ні спрэчак, ні сутычак,
Ні марнай штурханіны;
І зрэдку жменькай знічак
Праносяцца машыны.

Запалка

Ударыла блізка маланка — і выбіла пробкі.
І цемра густая напоўніла раптам пакой.
І я разгубіўся, ды быў гэты момант кароткі:
Запалка працягнута мне дружалюбнай рукой.



Без гучных прамоваў,
без казані пафасна-палкай,
Без ісцін грымотных — хоць іх
у скрыжалі ўпішы, —
Ціхмяны і сціплы мой сябар,
ты мне як запалка,
Калі раптам зробіцца цёмна
і страшна ў душы.

Я чыркну запалкай.
Ажно да апечаных пальцаў
Яна мне свяціцьме ў блуканнях
па цёмных кутах.
А потым упарта я ў памяці буду капацца,
Каб вобмацкам вызначыць
свой мудрагелісты шлях.

Маленькі кавалачак дзерава
з кропелькай серы,
Хвіліннае сонца, ратунак у змроку зямным,
Я веру ў цябе, калі ў іншае болей не веру,
Калі пагасаюць свяцілы адно за адным.

***

Запеніцца чарніла, забунтуе,
Пачырванее пена, быццам з вен,
Запоўніць цераз край душу пустую,
Прасочыцца праз маналіты сцен.

Лягчэе слова й набірае важкасць,
Сягае ў недасяжнасць вышыні.
І ў нашасць перакідваецца вашасць,
І блікі свечак топяць камяні.

***

Мы мелі хвіліну і ў тую хвіліну маглі
Змясціць усю слодыч, што прагу
натоліць зямлі.

Мы мелі гады, у якіх бракавала хвілін
І нечага шчэ, што не здольна прыйсці
ва ўспамін.

Мы ведалі вернасць, што горшай
бывала ад здрад.
Мы мелі набыткі, што нам
не папоўнілі страт.

І вось на мяжы, за якую мы мусім пайсці,
Так хочацца жыць, як ніколі дасюль
у жыцці.

***

З ідэі ў ідэю, з надзеі ў надзею,
У веру ізноў з паняверкі –
Вось так і жыву я, вось так і мадзею
І множу прыкідкі-прымеркі.
Куды ні прыду – у завулак, на плошчу –
Прасторы для сэрца не бачу,
І шчыра зайздрошчу, нязлосна зайздрошчу,
Хто ўмее і можа інакш.

Мы наш, мы новы…



Валянцін ДУБАТОЎКА

…І сказаў Яму д'ябал: табе дам уладу над усімі гэтымі царствамі і славу іх, бо яна аддадзена мне, і я, каму хачу, даю яе; і вось, калі Ты паклонішся мне, дык усё будзе Тваё.

Ісус сказаў яму ў адказ: адыдзі ад Мяне, сатана; напісана: «Госпаду Богу пакланяйся і Яму аднаму служы».

Паводле Лукаша Святое Дабравесце, раздзел 4: 6–8.

1. Мы — сіла

Паўлюшэнка пацягнуў бацюшку за доўгія сівыя валасы і нагой з усяго маху выцяў па твары. Пажылы святар застагнаў.

— Не-не, пастой, гэта яшчэ не ўсё, — злосна прабурчаў Сіўкоў, чыркнуўшы некалькі разоў запалкай.

— Бл…ць, прамоклі да рэшты, — адкінуўшы разлезлую каробку ўбок, Сіўкоў звярнуўся да Шэхмана:

— Дай сваіх, бачыш — мае не гараць.

Камсамолец, што ішоў наперадзе і цягнуў бацюшку за рукі, на хвіліну прыпыніўся, абтрос рукі, каб не забрудзіць нагавіцы, і сунуў руку ў кішэнь. Збіты чалавек, адчуўшы хвілінную палёгку, ціха застагнаў. Але і стагнаць яму было цяжка.

— Э-э, харош там марудзіць, бачыш — ён ужо ажывае, — уладна прамовіў Луковіч.

Камсамольцы замітусіліся. Праз хвіліну Шэхман працягнуў запалкі Сіўкову.

— Ну што, поп, зараз мы цябе паголім. — Шэхман нахіліўся, чыркнуў запалкай і паднёс агеньчык да барады збітага. Залітыя крывёй валасы не загараліся. Сіўкоў адну за адной нярвова адкідваў убок згарэлыя запалкі. Няўдалыя спробы падпаліць бараду бацюшкі яшчэ болей злавалі Сіўкова, і ён урэшце плюнуў на карабок і кінуў яго ў твар ахвяры.

— Бачыш, поп, з-за тваёй юшкі ніяк не магу распаліць вогнішча.

Ячэйка ў поўным складзе з'едліва і гучна зарагатала.

Святар сабраў усе свае сілы і ледзь чутна прашаптаў:

— Даруй ім, Госпадзе, не ведаюць, што вытвараюць.

— Даруй-падаруй, — перакрыўляючы бацюшку, здзекліва прамовіў Луковіч. Пасля павярнуўся да сваіх хаўруснікаў і зарагатаў. Камсамольцы падтрымалі свайго сакратара.

— Бачыш, поп, бяссільны твой Бог. Нічога ён з намі зрабіць не можа, і знаеш чаму? Таму, што мы сіла, за намі партыя, за намі Сталін і ўвесь Савецкі Саюз. А за табой хто? Папяровы ідал у драўлянай рамцы, — нібы на камсамольскім сходзе, упэўнена заявіў Луковіч.

Масіўнае цела збітага пажылога чалавека было цяжка валакчы па расхляпанай восеньскай дарозе. Чым болей камсамольцы стамляліся, тым даўжэй білі яны на прывалах сваю ахвяру.

Нарэшце працэсія выйшла на самае высокае месца ў наваколлі. Менавіта тут, на ўзвышшы, рос стары разгалісты дуб, каля якога жыхары навакольных вёсак святкавалі Купалле.

— У-ух, ну нарэшце дайшлі. Бачыш, поп, якую мы табе званіцу выбралі. Зараз туды цябе падсадзім, а там і да бога твайго недалёка, — здзекліва прамовіў сакратар.

Бацюшка расплюшчыў акрываўленыя павекі. Перад ім стаяў стары дуб. На залітым крывёю твары святара з'явілася ўсмешка.

— Вы паглядзіце на яго, ён жа з нас збыткуе, — прашамкаў збянтэжаны Луковіч і садануў кулаком па ацеклым твары.

Удар сакратара паслужыў сігналам астатнім камсамольцам, і яны, як ваўкі, накінуліся на паміраючага чалавека.

Бацюшка ўжо ніяк не рэагаваў на ўдары і толькі ўсё цішэй і цішэй гаварыў:

— Госпадзе, даруй, Госпадзе, даруй…

Тры дні вісела на дубе цела святара. І тры дні ішоў бясконцы восеньскі дождж, нібы абмываючы цела закатаванага. Мясцовыя сабакі і днём, і ноччу вылі ў наваколлі. Але ім, у адрозненне ад людзей, мясцовыя камсамольцы нічога не маглі зрабіць.

Праз тры дні цела бацюшкі некуды знікла. І колькі Луковіч і яго хаўруснікі ні шукалі, хто зняў нябожчыка з шыбеніцы — так нікога і не знайшлі.

А стары дуб неўзабаве засох. Перад самым пачаткам вайны ўначы ў яго трапіла маланка, і ён згарэў дарэшты.

2. Кат

Паўлюшэнку калаціла пасля ўчарашняга, як ад лютага марозу. Перасоўваўся ён па хаце павольна і асцярожна, як стары нямоглы чалавек. А было яму не болей за дваццаць пяць гадоў. З таго часу, калі Паўлюшэнка разам з іншымі камсамольцамі мясцовай ячэйкі закатаваў вясковага бацюшку, ён перастаў спакойна спаць. Каб хоць як-небудзь заснуць, гаспадар хаціны напіваўся кожны вечар да непрытомнасці.

Два месяцы таму жонка Паўлюшэнкі нарадзіла дзіця. Дзяўчынка з'явілася на свет кволай і пражыла на божым свеце ўсяго некалькі дзён. Жонка ад гора кранулася розумам. Яе забралі ў Навагрудскую бальніцу, дзе за тыдзень няшчасная згарэла ад невядомай хваробы.

— Дзе ж пахмяліцца? — думкі, нібыта надакучлівыя мухі, мітусіліся ў галаве небаракі. Дрыжачымі рукамі ён падняў з падлогі пажоўклы акурак і запаліў. Па хаце пацягнуўся шэры смуродлівы дым.

— От, бляха, — акурак апёк губу, і камсамолец выплюнуў яго на непадмецены ток. Злосна вылаяўшыся, ён сплюнуў сабе пад ногі і, асцярожна абапёршыся аб край засмечанага стала, вызірнуў у акно.

— Та-ак, у сельсавеце ўжо хтосьці ёсць, — павольна падняўся, накінуў на плечы фрэнч і выпаўз з хаты.

— Луковіч у сябе? — спытаўся Паўлюшэнка ў Шэхмана, які



Фота www.rosbalt.ru

стаяў на ганку, і, не чакаючы адказу, зайшоў у сельсавет.

— Гарэлка ёсць? — не вітаючыся, прагаварыў ён і ўзяўся метадычна абшукваць шафы і шкафчыкі кабінета.

— Ты што, зусім здурэў!? — уладна выкрыкнуў, падняўшыся са свайго месца, старшыня сельсавета.

— Пайшоў ты на х..! — не звяртаючы ўвагі на ўсхваляванага старшыню, прамовіў Паўлюшэнка і працягнуў пошукі.

— О-о! — з ніжняй шуфляды шафы для адзення камсамолец выцягнуў «польскі літар», напалову запоўнены мутнай вадкасцю. Ён дастаў корак і дрыжачымі рукамі нахіліў пасудзіну сабе ў рот. Выдыхнуў паветра і яшчэ раз прыкладся, смакуючы.

— Ты што робіш, паскудзіна? — але Паўлюшэнка ніяк не рэагаваў на лямант Луковіча. Старшыня рэзка падняўся і ў два крокі падскочыў да пітака. Пасля непрацяглае сутычкі «польскі літар» быў ужо ў старшыні.

— Хопіць! Згарыш ад гэтай гарэлкі, калі піць не кінеш!

— Ніколі.

— На лячэнне цябе адправім.

— А мне хоць куды, я ўжо ні спаць, ні есці не магу.

— Ну дык піць кінь, ты ж камсамолец.

— Знаеш, сакратар, як толькі кідаю піць, прывіды да мяне прыходзяць: жонка, дзіця. Людзі кажуць, каб у царкву схадзіў ды паніхіду па іх замовіў. Але не магу я туды ісці…

— Ты цемрашальства сваё кінь. Якая яшчэ царква? Гэта ўсё ад гарэлкі, усе твае прывіды, — Луковіч паставіў на стол бутэльку і падышоў да Паўлюшэнкі. — Кінь піць, выйдзі на працу — і ўсё будзе добра, — старшыня па-сяброўску абняў Паўлюшэнку за плечы.

— Дай яшчэ глытнуць, хоць раз!

— Не дам, пайшоў адсюль! — старшыня адпіхнуў п'янага на некалькі крокаў ад сябе. Не хочучы зноў ісці на абвастрэнне, Паўлюшэнка павольна выйшаў з будынка сельсавета і, ледзь перастаўляючы ногі, павольна пацёгся да сваёй хаты.

Ён прачнуўся ноччу мокры, як хрушч. Цела калацілася яшчэ мацней, чым звычайна.

— Тата, тата! — Паўлюшэнка павярнуў галаву і ўбачыў каля печы малое, якое цягнула да яго рукі. Ён падняўся, павольна падышоў да дзіцяці і паспрабаваў яго абняць. Але на тым месцы ўжо нікога не было.

— Дзе ты? — І ён раптам заўважыў на сваім ложку нябожчыцу-жонку і дзіця. Амаль нячутна падкраўся да ложка і, каб не спалохаць іх, ціхенька прылёг побач. Яму стала добра і лёгка. Каханая жонка была побач, тут жа — яго дзіцятка, жывенькае і здаровенькае…

Луковіч сядзеў за сталом і перабіраў партыйныя паперы.

— Таварыш старшыня! — ён падняў галаву ад стала і паглядзеў на дзверы.

У памяшканне забег запыханы Сіўкоў.

— Цішэй, цішэй ты, — прамовіў старшыня сельсавета.

Сіўкоў адсопся і крыкнуў:

— Паўлюшэнка павесіўся!

Луковіч ускочыў з месца:

— Што?!

— Паўлюшэнка павесіўся ў сваёй хаце.

— Як, не можа быць! — зніякавеў Луковіч.

— Перакінуў вяроўку праз бэльку… і ўсё, — разгублена прамовіў Сіўкоў. Абодва замоўклі.

Праз дзень на мясцовых могілках з'явіўся драўляны помнік з чырвонай зоркай. Прастаяў ён нядоўга. Падчас вайны хцівыя землякі Паўлюшэнкі сцягнулі абы-як збітую тумбу сабе на дровы. І ўжо праз некалькі гадоў нават самыя блізкія сваякі нябожчыка не маглі паказаць, дзе быў пахаваны былы камсамолец…

Юда

Падвода, як цяжарная баба, павольна перавальвалася праз камяні пыльнай палявой дарогі. Сіўкоў сядзеў у драбінах і жаваў свежы хлеб, які перад ад'ездам схапіў са стала. Да Навагрудка яшчэ было далёка, таму паразважаць пра жыццё ў Сіўкова быў час.

У паліцыі служыць можна, і плоцяць добра, і харч неблагі даюць, а галоўнае — увесь час нешта перападае. Тут Сіўкоў стаў успамінаць, колькі ён канфіскаваў маёмасці ў габрэяў ды ўсіх астатніх з таго часу, як стаў памочнікам начальніка мясцовай паліцыі. У траўні зганялі габрэяў у гета, а золата і срэбра цішком забіралі сабе. Расстралялі на тым тыдні савецкіх ваеннапалонных, ад іх засталіся шынялі і папругі. У мясцовых бальшавікоў… Пасля згадкі пра апошніх Сіўкову стала нейк не па сабе. Па-першае, ён сам да вайны ўваходзіў у мясцовую камсамольскую ячэйку. Па-другое, узяць у тых галадранцаў ды п'яніцаў не было чаго.

От і добра, што я ад іх уцёк. Хіба ж мне, гаспадарліваму, месца каля той басоты? А служба ў паліцыі — зусім іншая справа. Тут табе і грошы, і ўлада, і павага. А галоўнае — сканфіскаванага і дзецям хопіць. А яны ў мяне такія харошыя: старэйшая дзяўчынка і малодшы хлопчык. Ён на хвіліну ўявіў, як будзе важна жыць пры немцах пасля вайны. Сіўкоў выпадкова зірнуў на гадзіннік, які зняў летась з расстралянага палітрука. Хутка полудзень, трэба спяшацца. Пад вечар маецца быць экзекуцыя ў адной з мясцовых вёсак. А як жа без мяне, можа, і там штосьці перападзе.

— Но-о, но-о, каб цябе халера! — паліцай з усяе сілы сцебануў кабылу пугай. Тая ад болю і страху ірванула з месца, як ашпараная. Акаваныя колы падводы залескаталі па дарожных камянях, нібы танкавыя гусеніцы.

Паўдня прамарудзіўшы, Сіўкоў выйшаў з будынка камендатуры і акінуў поглядам наваколле. Цёплы летні вечар надыходзіў няўмольна. Паліцай спрытна залез на падводу і па-гаспадарску ўсеўся на загадзя падрыхтаванае месца.

Да роднай вёскі заставалася толькі адолець горку і мінуць пералесак. У гэты самы момант Сіўкоў заўважыў, як з-за лесу вырастае вялізны клуб дыму.

Паліцай падганяў кабылу. Трывога ў душы нарастала. Не чакаючы, калі падвода ўзбярэцца на пагорак, Сіўкоў, прытрымліваючыся за драбіны, падняўся на ногі.

Убачанае ўразіла Сіўкова. Родная вёска гарэла ўся: ад пачатку да канца.

— Яці тваю маць, паляць вёску! А мая хата!? — Сіўкоў стараўся разгледзець сярод дыму свой падворак, але гэта яму не ўдавалася.

— Сукі, а маю хату навошта, я ж свой! — пад'язджаючы да свайго, таксама ахопленага полымем жытла, ён на хаду саскочыў з падводы. Паліцай з мацюкамі бегаў вакол хаты і спрабаваў хоць штосьці ўратаваць. У агні гінула ўсё, што было дорага яму: грошы, рэчы. І тут ён раптам спахапіўся: а жонка, дзеці… дзе яны?! Сіўкоў прыслухаўся. Дзесьці здалёк чуліся крыкі.

Няўжо ў старой Каўшовай кузні паляць? Сіўкоў імгненна ўскочыў на падводу.

— Но пайшла, но!

Перапалоханая кабыла зноў рванула з месца. Праз некалькі хвілін падвода прыімчала да кузні.

— Што ж вы робіце?! Што ж вы робіце?! — залямантаваў ашалелы Сіўкоў. Салдаты з Вафэн СС у чорнай форме з аўтаматамі наўзгатоўку шчыльнымі шыхтамі стаялі вакол палаючай кузні і ніяк не рэагавалі на крыкі паліцая.


— Што ж вы робіце, панове, там жа мае дзеці! — Сіўкоў, як сабака, бегаў, круціўся каля карнікаў. І калі ён у бездапаможнасці і разгубленасці на хвіліну спыніўся, то пачуў сярод іншых крыкаў галасы сваіх дзяцей.

— Тата, ратуй нас, тата!

Сіўкоў хацеў кінуцца ў вогнішча, але агонь, як люты звер, адагнаў яго. Паліцай у роспачы ўпаў на зямлю і жудасна заенчыў.

За гадзіну кузня дагарэла. За некалькі крокаў ад галавешак, адкінуўшы ўбок правую руку з рэвальверам, ляжала масіўнае цела ў паліцэйскай форме. Са скроні на апаленую зямлю сцякала рудая цягучая кроў…

Кастусь Каліноўскі



Уладзімір АРЛОЎ

Гэты чалавек марыў пра незалежную будучыню для народаў былой Рэчы Паспалітай і найперш — для сваіх суайчыннікаў-беларусаў. Кастусь пражыў кароткае, але яскравае гераічнае жыццё, аддадзенае змаганню за свабоду і справядлівасць.

З роду «Калінова»

Будучы паўстанцкі камандзір нарадзіўся 2 лютага 1838 года ў беларускай вёсцы Мастаўляны на беразе Свіслачы. Вёска спрадвеку была ў Гарадзенскім павеце, але цяпер яна знаходзіцца ў Падляшскім ваяводстве Польшчы. У Мастаўлянах, што зусім побач з мяжой Беларусі, і ў нашы дні гавораць па-беларуску.

Беларускі шляхецкі род Каліноўскіх, вядомы ад XVII стагоддзя, карыстаўся гербам «Калінова». Хлопчыка ахрысцілі двойчы, і ён меў два імя, але ў паўсядзённым жыцці яго заўсёды называлі адным — Кастусь.

Кастусёў бацька Сымон валодаў ткацкай фабрыкай, а пазней і маёнткам Якушоўка паблізу мястэчка Свіслач. Сымон Каліноўскі быў руплівым і заможным гаспадаром: абрусы, сурвэткі, бялізна з ягонай фабрыкі добра прадаваліся па ўсёй Гарадзеншчыне. Маці нашага нацыянальнага героя Веранiка таксама паходзіла са шляхты. Яна пакінула гэты свет, калі сыну было ўсяго пяць гадоў. Кастусь меў дзесяць родных братоў і сясцёр, але бальшыня з іх рана памерла ад хваробаў. Больш за ўсіх пражыў Кастусь, хоць і яму выпаў кароткі век — усяго 26 гадоў.

Спачатку хлопчык вучыўся ў хатняга настаўніка-«дарэктара», а потым скончыў знакамітую Свіслацкую гімназію, дзе жыла моцная памяць пра філаматаў і філарэтаў. Там спасцігалі навуку шмат вядомых пазней людзей — мастакоў, пісьменнікаў, вучоных. У гэтай навучальні крыху раней за Каліноўскага займаліся Рамуальд Траўгут, Уладзіслаў Малахоўскі, Адольф Белакоз ды іншыя юнакі з навакольных шляхецкіх сем'яў, якія потым сталі ўдзельнікамі і кіраўнікамі збройнага змагання з царызмам. Гімназіст Каліноўскі вылучаўся удумлівасцю і стараннасцю, а таксама тым, што ніколі не цярпеў хлусні і несправядлівасці.

Пасля гімназіі Кастусь тры гады дапамагаў бацьку на маянтковай гаспадарцы ў Якушоўцы, куды з Мастаўлянаў пераехала і ткацкая фабрыка. Ён быў працавітым і кемлівым юнаком, але імкнуўся вучыцца далей — ва ўніверсітэце. У вольныя ад працы хвіліны Кастуся найчасцей можна было ўбачыць з кнігамі і сшыткамі. Апрача таго, Сымон Каліноўскі ажаніўся другі раз, а з мачахай стасункі ў Кастуся былі не надта цёплыя: ён не мог забыць чуласць і клапатлівасць матулі Веранікі.

Брат Віктар

Найлепшым сябрам Кастуся стаў старэйшы на пяць гадоў брат Віктар. Той ужо быў студэнтам Маскоўскага ўніверсітэта. Вучыўся на медыцынскім факультэце, хацеў стаць доктарам і ратаваць людзей ад хваробаў, бо з дзяцінства памятаў, як памірала маці, як згасалі ад немачаў браты і сёстры. Аднак сам захварэў на невылечныя тады сухоты (туберкулёз) і мусіў зноў і зноў перапыняць навучанне. Урэшце Віктара выключылі з універсітэта, але не праз слабое здароўе, а таму, што ўзяў на сябе віну іншага студэнта, абвінавачанага ў распаўсюдзе забароненых антыўрадавых кніг.

У Маскве старэйшы брат Кастуся зарабляў на жыццё тым, што на замовы ліцвінскіх магнатаў і шляхты збіраў звесткі пра іхнія радаводы. Дзеля гэтага трэба было працаваць у архіўных сховішчах. Туды расейскія каланізатары звозілі з Літвы-Беларусі ўсе каштоўныя гістарычныя дакументы, у тым ліку і шляхецкія архівы. Віктар захапіўся мінулым роднага краю, найперш тымі часамі, калі ліцвіны-беларусы мелі сваю незалежную дзяржаву. Грунтоўна займаўся ён і вывучэннем межаў тэрыторыі, дзе гавораць па-беларуску. Цікавасць да гісторыі ён перадаў і Кастусю. Малодшы брат пераехаў у Маскву і рыхтаваўся да ўніверсітэцкіх уступных экзаменаў, адначасова дапамагаючы старэйшаму ў архіўнай працы.

Маскоўскія гістарычныя росшукі Віктара Каліноўскага заўважыла і высока ацаніла Віленская археалагічная камісія. Яе для вывучэння беларускай даўніны стварылі гісторыкі Яўстах і Канстанцін Тышкевічы з аднадумцамі. Камісія замовіла Віктару пошук нашых старадаўніх дакументаў у Пецярбурзе. Разам з братам у сталіцу Расейскай імперыі накіраваўся і Кастусь.

Асноўным месцам працы старэйшага Каліноўскага была Пецярбургская публічная бібліятэка. Ён бываў там штодня і заслужыў у сяброў мянушку Бібліятэкар. Віктар пісаў, што асабліва радаваўся, калі знаходзіў дакументы «на гаворцы крывіцкай, якую можна назваць беларускай». Ён жыў вельмі сціпла, а большую частку зробленых грошай траціў на кнігі, сабраўшы цэлую бібліятэку з двухсот тамоў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Але Віктар Каліноўскі меў важныя справы і за сценамі архіваў і бібліятэк. Яго нездарма называлі другім Тамашом Занам. Як і кіраўнік таемнага таварыства філарэтаў, Віктар самаахвярна працаваў у падпольных суполках, рыхтаваў да ўступлення ў іх моладзь. Сярод ягоных выхаванцаў быў сын расейскага купца-мільянера Мікалай Уцін. Ён потым стаў адным з важакоў рэвалюцыйнага таварыства «Зямля і воля».

У жніўні 1862 года над Віктарам навісла пагроза арышту. Тым часам дактары паведамілі, што сухоты пакідаюць яму ўсяго некалькі месяцаў жыцця. Каліноўскі-старэйшы вярнуўся ў бацькоўскі дом, дзе і прайшлі ягоныя астатнія дні. Віктар пахаваны ў мястэчку Свіслач. Цяпер у гонар брата нашага нацыянальнага героя там штогод святкуецца Дзень памяці паўстанцаў.

Вольнае сэрца

Канстанцін Каліноўскі вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта. Першыя два гады ён не мог нарадніцца добрымі адзнакамі, бо амаль увесь вольны ад лекцый час мусіў зарабляць грошы на жыццё прыватнымі ўрокамі. Але ў выніку скончыў універсітэт выдатнікам.

Выкладчыкі і не здагадваліся, што здольны студэнт разам з братам Віктарам уваходзіць у таемны рэвалюцыйны гурток суайчыннікаў — афіцэраў Генеральнага штаба расейскай арміі. На чале суполкі стаялі будучыя кіраўнікі вызвольнага паўстання 1863 года Зыгмунт Серакоўскі і Яраслаў Дамброўскі.

Кастусь Каліноўскі быў бліскучым канспіратарам. Ён безліч разоў абводзіў вакол пальца царскіх жандараў, якія часта ўжо ішлі за ім па пятах і былі ўпэўненыя, што вось-вось «асабліва небяспечны злачынец» будзе ў іхніх руках.

Кастусь таксама ненавідзеў царскую ўладу ды імперскія парадкі. Пэўны час у гады студэнцтва ён, пратэстуючы супроць казённых універсітэцкіх правілаў, хадзіў не ў вызначаным адзенні, а ў сурдуце і ботах, а замест гальштука завязваў на шыю прывезены з дому беларускі ручнік.

Каліноўскі марыў пра вызваленне Айчыны і рыхтаваўся да барацьбы. Ён пакляўся прысвяціць гэтай справе ўсё жыццё. Ягонае сэрца прагнула здабыць волю не толькі для сябе, але і для ўсяго народа. Агіду і абурэнне выклікала ў Кастуся прыгоннае права, што набліжала сялянаў да становішча рабоў.

На пачатку 1861 года Каліноўскі здаў выпускныя іспыты, абараніў дысертацыю і атрымаў навуковую ступень кандыдата права. Выбар далейшага шляху быў ужо зроблены. Ён вяртаецца ў родную Літву-Беларусь і спрабуе ўладкавацца на службу да самога віленскага генерал-губернатара. Менавіта з былой сталіцы Вялікага Княства Кастусь плануе пачаць стварэнне сеткі паўстанцкіх суполак і падрыхтоўку збройнага змагання. Але, нягледзячы на рэкамендацыі ўплывовых сяброў і самога губернатарскага ад'ютанта, свайго будучага баявога паплечніка Людвіка Звяждоўскага, Кастусю няма даверу, і ён паўсюль атрымлівае адмову.

Каліноўскі вярнуўся на Гарадзеншчыну. Для прыкрыцця сваёй дзейнасці ён хацеў уладкавацца на працу следчым, але і гэтым разам у начальства ўзніклі сумневы. Трапіць на дзяржаўную службу зноў не атрымалася, аднак галоўная мэта не дазваляла марудзіць. Каліноўскі хутка стварыў моцную Гарадзенскую таемную арганізацыю і стаў сябрам віленскага цэнтра падрыхтоўкі паўстання.

«Мужыцкая праўда» кліча да зброі

Улетку 1862 года ў беларускіх вёсках і мястэчках пачалі знаходзіць невялікія друкаваныя аркушы. У хвіліны адпачынку іх можна было разгладзіць на каленях, а пачытаўшы — лёгка схаваць. Гэта была першая ў гісторыі беларуская газета — «Мужыцкая праўда». Прачытаўшы яе назву, пісьменны селянін вадзіў пальцам па радках і здзіўлена адкрываў для сябе, што газета на зразумелай мове сапраўды гаворыць пра мужыцкую долю.

«Мужыцкую праўду» выдавалі Кастусь Каліноўскі з аднадумцамі — Феліксам Ражанскім, Станіславам Сангінам і Валерам Урублеўскім. Пад кожным нумарам газеты, якая выходзіла лацінскімі літарамі, стаяў подпіс — «Яська-гаспадар з-пад Вільні». Тым таямнічым Яськам назваўся сам Каліноўскі, які быў аўтарам і рэдактарам бальшыні нумароў. Ён сам займаўся і пашырэннем газеты: развозіў па паселішчах, раскідваў на дарогах.

Кастусь меў яскравы літаратурны талент. Дзякуючы гэтаму «Мужыцкая праўда» чыталася лёгка і проста, хоць і вяла гаворку пра зусім няпростыя рэчы. Газета тлумачыла беларусам, як царская ўлада іх падманвае і прыгнятае, як адбірае ў іх не толькі цяжка зробленыя грошы, але і родную мову ды бацькоўскую веру.

У першым нумары Яська-гаспадар пісаў: «Дзецюкі! Цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаць такую праўду справядлівую, як Бог на небе. Загрымішь нашая праўда і, як маланка, праляціць па свеце! Няхай спазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, але яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўдзе...». Словы Каліноўскага рабіліся крылатымі. Шмат якія з іх і сёння, праз паўтара стагоддзя, гучаць як надзённыя.

«Мужыцкая праўда» разляталася па ўсім абшары Беларусі. «У нас, дзецюкі, адно вучаць ў школах, каб ты знаў чытаці па-маскоўску, а то для таго, каб цябе саўсім перарабіці на маскаля... — звярталася газета да чытачоў. — За тое, што мы цару 25 гадоў на войнах служым без людскае стравы і адзежы, не дае нават кавалка зямлі... Ён, перакупіўшы многа папоў, плаціў грошы, каб толькі пераходзілі на праваслаўе, і адабраў ад нас нашу справядлівую вуніяцкую веру і пагубіў нас перад Богам навекі».

Усяго з ліпеня 1862 года да красавіка 1863-га пабачылі свет сем нумароў газеты. Яна мела сярод сялян значны водгук. Шмат хто таемна чытаў «Мужыцкую праўду» непісьменным аднавяскоўцам, пакідаў газетныя аркушы ў людных месцах, каля капліц і крыжоў на раздарожжах, прыносіў у цэрквы і касцёлы.

Апошні нумар «Мужыцкай праўды» выйшаў ужо ў час паўстання. Там гучаў адкрыты заклік да збройнага змагання з каланізатарамі: «Падумайце добра ды, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашу вольнасць! Трэба нашым хлопцам спяшаць з віламі ды з косамі туды, дзе дабіваюцца волі ды праўды».

Няўлоўны, як вецер

Кастусь Каліноўскі быў бліскучым канспіратарам. Ён безліч разоў абводзіў вакол пальца царскіх жандараў, якія часта ўжо ішлі за ім па пятах і былі ўпэўненыя, што вось-вось «асабліва небяспечны злачынец» будзе ў іхніх руках.

У кастрычніку 1862 года, калі да пачатку паўстання заставаліся лічаныя месяцы, Кастусь ехаў са Слоніма ў Ваўкавыск. У Слоніме ён сустракаўся з афіцэрамі артылерыйскай батарэі, якія падтрымлівалі вызвольны рух, а таксама з сябрамі патрыятычнай суполкі, што для прыкрыцця сваёй дзейнасці збіраліся пад выглядам чытачоў у гарадской бібліятэцы. Па дарозе Кастусь, як заўсёды, паўсюль пакідаў свежыя нумары «Мужыцкай праўды». Яны трапілі ў мястэчкі Ружаны і Падароск ды ў навакольныя вёскі. Весткі пра гэта дайшлі да слонімскага жандарскага прыстава. На паштовай станцыі, дзе падарожнік наймаў коней, прыстаў высветліў, што з «крамольнай газеткай» ехаў шляхціч Каліноўскі.

Рапарт пра гэта паляцеў гарадзенскаму губернатару, які загадаў жандарам неадкладна арыштаваць «смутьяна». Дзясяткі жандараў пачалі допыты іператрусы ў дамах, дзе спыняўся Кастусь. Пра вынікі пошукаў яны мусілі данесці самому царскаму міністру ўнутраных справаў.

На панараме — Лукішская плошча Вільні ў дзень пакарання смерцю правадыра паўстання Кастуся Каліноўскага. Гэтай марознай раніцай плошча ачэпленая ротай расейскіх салдатаў, а таксама казацкай вартай. Падрыхтоўкай да экзэкуцыі кіруюць жандарскія афіцэры. Некалькі сотняў віленчукоў прыйшлі на Лукішкі, каб убачыць апошнія хвіліны «караля Літвы». Сярод іх і паплечнікі Каліноўскага. Расейскія карнікі не падпускаюць людзей да шыбеніцы бліжэй за сотню метраў. Праз некалькі хвілін з'явіцца чорная арыштанцкая карэта, і Лукішкі сустрэнуць яе цяжкім гулам. Цяпер на гэтай плошчы ўсталяваны мемарыял, куды кожны дзень прыходзяць нашыя суайчыннікі, каб аддаць даніну памяці вялікаму беларусу.

Тым часам няўлоўны Каліноўскі ў клопатах пра сваю таемную арганізацыю паспеў наведаць Вялікую Бераставіцу і Гародню, дзе не раз спакойна праходзіў каля губернатарскага дома.

Сакрэтны паліцэйскі нагляд усталявалі за маёнткам Каліноўскіх — Якушоўкай, але Кастусь здолеў таемна завітаць і туды, каб сустрэцца з бацькам і наведаць магілу нядаўна памерлага брата Віктара. Жандары атрымалі звесткі, што далей Каліноўскі накіраваўся ў Вільню, а той быў ужо у Пецярбурзе: вёў перамовы пра падтрымку з таемным таварыствам «Зямля і воля».

У часе самога паўстання жандары таксама мелі некалькі магчымасцяў схапіць правадыра змагароў, але ён заўсёды вырываўся з расстаўленых пастак. Аднаго разу ўзімку паліцыя ўварвалася ў віленскую кватэру на Зарэчнай вуліцы, дзе начаваў Кастусь. Ён паспеў у адной бялізне выслізнуць у вакно. Некалькі гадзін праляжаў на халодным, нібы лёд, даху, гледзячы на зоркі, але не выдаў сябе ніводным рухам. Калі няпрошаныя госці пайшлі, Кастусь быў з заінелымі валасамі і настолькі змерзлы, што ледзьве варушыў рукамі і нагамі. Аднак яго грэла думка, што застаўся на волі і не навёў бяды на гаспадароў, якія далі яму прытулак.

Некалькі разоў, загрымаваны і апрануты як царскі службовец, Каліноўскі знаходзіўся ў віленскіх кавярнях адначасова з царскімі жандарамі. Тыя мелі падрабязнае апісанне аблічча паўстанцкага правадыра, але і ўявіць не маглі, што той п'е каву за суседнім сталом…

У канспірацыі выдатна дапамагала Кастусю веданне моваў: апрача беларускай і польскай ён добра валодаў расейскай, французскай і нямецкай.

Дзеля будучыні Айчыны

Яшчэ ўвосень 1862 года Каліноўскі ўзначаліў Літоўскі правінцыйны камітэт, які рыхтаваў збройную барацьбу супроць царскай улады ў Літве-Беларусі. Пасля пачатку паўстання Літоўскі камітэт абвясціў сябе Часовым урадам. Каліноўскі не хацеў падпарадкоўвацца варшаўскаму кіраўніцтву і патрабаваў раўнапраўя Вільні з Варшавай.

Кастусь і яго аднадумцы, якіх называлі «чырвонымі», выступалі за роўнасць усіх жыхароў краю і за перадачу зямлі сялянам. Часовы ўрад рассылаў паўстанцкім камандзірам інструкцыю, якая патрабавала судзіць найбольш жорсткіх прыгнятальнікаў сялян ваенным судом і караць іх смерцю. Каліноўскі лічыў, што ў будучым народы Рэчы Паспалітай, разарванай на кавалкі агрэсіўнымі суседзямі, павінны самі вырашаць свой лёс. Ён быў прыхільнікам таго, каб дзяржаўным ладам новых вольных краін была рэспубліка. «Белыя» дзеячы ў кіраўніцтве паўстання баяліся простага народу і найперш хацелі аднавіць колішнюю дзяржаву ў межах, якія яна мела да трох падзелаў. У той дзяржаве са сталіцай у Варшаве рэй павінны былі весці палякі.

«Белым» удалося адхіліць Каліноўскага ад кіраўніцтва. Кастусь стаў паўстанцкім камісарам Гарадзенскай губерні. Ён прыцягнуў да паўстання шмат сялянаў, што таксама не падабалася яговым праціўнікам.

Каліноўскі аб'язджаў павет за паветам. Ён інспектаваў аддзелы патрыётаў і натхняў іх на далейшае змаганне. Тыя, хто вылучыўся ў баях з расейскім карнікамі, атрымлівалі з рук камісара ўзнагароды. Сваіх баявых медалёў і ордэнаў паўстанцкае камандаванне не мела, а таму героям перад шыхтом баявых таварышаў часам проста ўручалі кветкі. Часта гэта былі белыя кветкі каліны. Засушаную паміж старонкамі паходнага нататніка «каліну ад Каліноўскага» паўстанцы берaглі як неацэнны скарб, каштоўнейшы за ордэн.

На Гарадзеншчыне і Віленшчыне Каліноўскага пачалі называць «каралём Літвы». Усё часцей казалі, што ён хоча ўтварыць на землях былога Вялікага Княства Літоўскага асобную дзяржаву, незалежную ні ад Польшчы, ні ад Расеі. Пра гэтую адданасць Айчыне пазней напішуць ва ўспамінах і сябры, і непрыяцелі Кастуся.

Неўзабаве Каліноўскі і «чырвоныя» зноў прыйшлі да ўлады ў віленскім паўстанцкім цэнтры. Яны выдалі на беларускай мове «Прыказ да народу зямлі літоўскай і беларускай». Там гаварылася, што паўстанне — справа не панская, а агульная і змаганне ідзе дзеля «справядлівай вольнасці». Улетку 1863 года Кастусь зноў атрымаў вярхоўную ўладу над паўстанцкімі дзеяннямі ў Літве-Беларусі і працягваў адстойваць сваю, незалежную ад Варшавы палітыку.

Пад націскам шматкроць большых сілаў расейскіх карнікаў паўстанне ўжо задыхалася. Немалая частка шляхты, каб захаваць маёнткі, пайшла на згоду з расейскай уладай. Каліноўскі патрабаваў ад падначаленых бязлітасна караць адступнікаў.

Апошнія месяцы змагарнага 1863-га Каліноўскі жыў у Вільні пад штодзённай пагрозай арышту. З Пецярбурга яму даслалі пашпарт на чужое імя, што дазваляла выехаць за мяжу. Таварышы ўгаворвалі правадыра пакінуць Расейскую імперыю, але ён пастанавіў не пакідаць Айчыны і да канца змагацца за справу, якой прысвяціў жыццё.

Затрымаць Каліноўскага расейскім уладам не ўдавалася да канца студзеня 1864 года. Але здраднік Вітаўт Парфіяновіч на допыце выдаў паўстанскага правадыра, што жыў у Вільні побач са Святаянаўскім саборам пад імем Ігната Вітажэнца. Каб арыштаваць Кастуся, паслалі цэлыя дзве роты царскіх салдат, якія акружылі ўвесь гарадскі квартал.

Нарачоная Марыя

Каханай адважнага паўстанцкага камандзіра стала віленчанка Марыя Ямант. Яна была сястрой надзейнага Кастусёвага сябра і аднадумца Язэпа. Юнакі пасябравалі яшчэ ў Пецярбургскім універсітэце. Калі Каліноўскі вярнуўся на радзіму рыхтаваць паўстанне, Язэп Ямант кінуў навучанне і паехаў следам. Кастусь часта бываў па сваіх рэвалюцыйных справах у Вільні, і сям'я Ямантаў прапанавала яму спынiяецца ў іхняй кватэры на вуліцы Вялікай у самым цэнтры былой ліцьвінскай сталіцы. Там і адбылася першая сустрэча Кастуся і Марыі. Сябры потым сцвярджалі, што гэта было каханне з першага позірку.

На двары пачыналася вясна 1861 года. Каліноўскі меў дваццаць тры гады, Марыя — на тры меней. Яна была адукаванай дзяўчынаю: валодала замежнымі мовамі, добра ведала гісторыю, шмат чытала. Каліноўскі хутка зрабіўся ў Ямантаў самым жаданым госцем. Але гасцяваў ён не часта, бо мусіў бясконца вандраваць па Беларусі, гуртуючы змагарскія сілы. Калі закаханыя расставаліся, яны давяралі свае пачуцці шчырым і пяшчотным лістам.

Праз год пасля знаёмства Марыя зрабілася нарачонаю Кастуся. Яна атрымала ад каханага заручальны пярсцёнак і проста свяцілася шчасцем, хоць і прадчувала, што наперадзе іх чакаюць нялёгкія выпрабаванні. Надзею на хуткае вяселле перакрэсліў пачатак паўстання. Кватэра Ямантаў ператварылася ў сапраўдны паўстанцкі штаб. Менавіта там Каліноўскі сустракаўся з камісарам Нацыянальнага ўрада ў Варшаве і адстойваў будучую самастойнасць народаў Вялікага Княства Літоўскага і перадачу зямлі сялянам.

Тым часам Марыя разам з сёстрамі стварыла ў Вільні жаночы камітэт. Яго ўдзельніцы збіралі ахвяраванні для паўстанцкіх сем'яў, разносілі пошту, усялякімі шляхамі перадавалі зняволеным у турмах ежу, гарбату, свежую бялізну.

Той самай студзеньскай ноччу, калі царскія служкі схапілі Каліноўскага, арыштавалі і сям'ю Ямантаў. Кастусь быў зняволены ў былым дамініканскім кляштары, а Марыя — у манастырскіх мурах насупраць. Цётка Марыі — Ядзвіся — падкупіла ахову і здолела наладзіць паміж нарачонымі ліставанне. У адной з цыдулак да любай Каліноўскі пісаў: «Зайздрошчу свабодзе вароны, якую бачу з вакна на снезе». У тыя неверагодна цяжкія дні кожная вестачка адно аднаму дадавала душэўных сілаў.

Разам з бацькамі і сястрой Марыю, паводле выраку расейскіх суддзяў, выслалі на дзесяць гадоў у сібірскі горад Табольск. Увесь гэты тэрмін яна насіла жалобу па каханым.

Лісты з-пад шыбеніцы

На следстве і на судзе Кастусь трымаўся непахісна. З турэмнай камеры Каліноўскі дзякуючы Марысьчынай цётцы Ядвісі перадаў на волю напісаны па-беларуску запавет — «Лісты з-пад шыбеніцы», якія ў арыгінале называюцца «Да люду беларускага». Над словамі запавета нам варта глыбока задумацца і сёння: «З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці і, можа, раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, ды не жаль загінуць за тваю праўду… Няма большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек мае розум і навуку. Тады ён толькі зможа жыць у багацці і па праўдзе. Але як дзень з ноччу не ходзіць разам, так не ідзе разам навука праўдзівая з няволяй маскоўскай. Ды пакуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва і ніякай навукі, адно намі, як скацінай, варочаць будуць, не для дабра, а на пагібель нашу».

Каліноўскі не жадаў няшчасця расейскаму народу, але лічыў, што ў выніку доўгага і ганебнага мангола-татарскага ярма і царскага прыгнёту з азіяцкімі парадкамі ў нашых суседзяў укаранілася няволя ды імкненне панаваць над усім светам. Таму, звяртаючыся да суайчыннікаў, Кастусь пісаў: «З-пад шыбеніцы кажу, народзе, што толькі тады зажывеш шчасліва, калі над табою маскаля ўжо не будзе».

Запавет Каліноўскага быў цалкам надрукаваны ў Беларусі толькі тады, як пачаў развальвацца Савецкі Саюз — бальшавіцкая імперыя, што прыйшла на змену царскай. У ёй беларусы, як і іншыя народы, па-ранейшаму не мелі сапраўднай свабоды. Сёння ў нашай незалежнай краіне таксама ёсць сілы, што хацелі б вярнуць Беларусь назад, у падпарадкаванне Расеі. Яны баяцца памяці пра легендарнага Кастуся, які аддаў жыццё за волю і самастойнасць Айчыны.

Хлусня пра Каліноўскага трапляе нават у школьныя падручнікі. З праграмы па беларускай літаратуры выкінутая і «Мужыцкая праўда», і «Лісты з-пад шыбеніцы»…

Магіла героя

Расейскі суд вынес пастанову расстраляць кіраўніка паўстання, але віленскі генерал-губернатар Мураўёў, празваны Вешальнікам, замяніў пакаранне на павешанне. Смерць на шыбеніцы была больш пакутлівай. Герой, якому нядаўна споўнілася ўсяго дваццаць шэсць летаў і зім, загінуў ад рук царскага ката 22 сакавіка 1864 года на Лукішскім пляцы ў Вільні. На месцы, дзе гэта адбылося, цяпер пастаўленая мемарыяльная пліта.

Цела Каліноўскага перавезлі на Замкавую гару (у наш час яна вядомая як гара Гедзіміна) і пахавалі разам з яшчэ дваццацю пакаранымі смерцю паўстанцамі на тэрыторыі расейскага гарнізона. Каб магіла паўстанцкага правадыра і яговых паплечнікаў не зрабілася месцам пакланення патрыётаў, каланізатары зрабілі там пляцоўку для гульні ў крыкет. Расейскія афіцэры забаўляліся на касцях нашых герояў да пачатку Першай сусветнай вайны, пакуль царскі гарнізон не змушаны быў пакінуць Вільню.

У 1920–1930 гады на магіле паўстанцаў існаваў мемарыял з іхнімі імёнамі. Аднак пасля таго, як у 1939-м Сталін аддаў Вільню літоўцам, мемарыял быў апаганены і знішчаны. Надмагільнага помніка Каліноўскаму і яговым баявым пабрацімам няма дагэтуль. У 2017–2018 гадах літоўскія археолагі даследавалі братнюю магілу на гары Гедзіміна і пацвердзілі, што там сапраўды пахаваны 21 паўстанец. Былі знойдзеныя і парэшткі Кастуся Каліноўскага са звязанымі за спінай рукамі. Найверагодней, якраз яму належаў знойдзены ў братняй магіле медальён з абразком Маці Божай Вастрабрамскай.

Парэшткі паўстанцаў будуць перапахаваныя на віленскіх могілках Росы. Шмат хто марыць, што прах нашага нацыянальнага героя Кастуся Каліноўскага некалі вернецца ў Беларусь і ягоная магіла стане велічным народным мемарыялам.

Ілюстрацыя Паўла Татарнікава



«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 7 (155) | 26 ліпеня 2019 | № 28 (639) Новы час

Аўтапсіхаграфія



Фэрнанду ПЭСОА
(FERNANDO PESSOA) (1888–1935)

Самы знакаміты партугальскі паэт XX стагоддзя. Пісаў творы на партугальскай і ангельскай мовах, падпісваючыся рознымі гетэронімамі, якіх некаторыя даследнікі налічваюць не менш за 72, кожны са сваім уласным голасам, біяграфіяй і эстэтычнай праграмай. Найбольш вядомыя з іх — Алвару дэ Кампуш (Álvaro de Campos), Рыкарду Рэйш (Ricardo Reis) і Албэрту Каэйру (Alberto Caeiro).

Поўнае яго імя — Фэрнанду Антонію Нугейру Пэсоа. Нарадзіўся 13 чэрвеня 1888 года ў Лісабоне. Ва ўзросце пяці гадоў будучы пісьменнік страціў бацьку, які памёр ад туберкулёзу, а хутка і малодшага брата, якому не было нават года. У 1895-м яго маці выходзіць замуж у другі раз за консула Партугаліі ў Дурбане, і яны пераязджаюць у Паўднёвую Афрыку. Там ён атрымлівае адукацыю і выяўляе ранні талент да літаратурнай творчасці. Там жа знаёміцца з творамі Ў. Шэкспіра, Э. По, Дж. Мілтана, Дж. Г. Байрана, Дж. Кітса, П. Б. Шэлі, А. Тэнісана і іншых. Ангельская мова адыграе значную ролю ў жыцці паэта.


У 1905 годзе, пакінуўшы сям'ю ў Афрыцы, Пэсоа вяртаецца ў Партугалію, каб вывучаць літаратуру. У 1906-м ён паступае на Вышэйшыя літаратурныя курсы (цяпер філалагічны факультэт Лісабонскага ўніверсітэта), але не вытрымлівае і аднаго года. У гэты ж час ён знаёміцца з найбуйнейшымі партугальскімі пісьменнікамі. У наступным годзе памірае бабуля паэта, дзякуючы невялікай спадчыне якой Пэсоа адчыніў маленькую друкарню, якая, праўда, хутка збанкрутавала. З 1908 года і да апошніх дзён паэт займаўся перакладамі камерцыйнай карэспандэнцыі, ведучы даволі сціплае грамадскае жыццё.

З 1912 года Пэсоа пачынае выступаць у перыядычных выданнях як эсэіст і літаратурны крытык. У 1915-м разам з іншымі паэтамі, такімі як Алмаду Нэгрэйруш і Марыю дэ Са-Карнэйру, ён выдае літаратурны часопіс «Арфей», які запачаткаваў мадэрнізм у партугальскай літаратуры. У 1918 годзе выходзяць дзве ангамоўныя кнігі Пэсоа — паэма «Антыной» і «35 санэтаў». Разам з двума кампаньёнамі Пэсоа засноўвае яшчэ адну друкарню, у якой у 1921-м выходзяць яшчэ два зборнікі яго англамоўнай паэзіі — «Ангельскія вершы I-II» і «Ангельскія вершы III». Пэсоа перакладае некалькі кніг з ангельскай на партугальскую, а таксама вершы Э. По «Крумкач» і «Анабэль Лі».

З таго часу, як Пэсоа вяртаецца з Афрыкі ў Партугалію, ён вельмі рэдка выязджае з любімага Лісабона. Менавіта найбольш цікавым мясцінам і атмасферы горада прысвечаная «Кніга неспакою», яшчэ адзін значны твор, напісаны чацвертым з самых вядомых гетэронімаў Пэсоа — Бэрнарду Суарэшам. Аднак і ён не быў апублікаваны пры жыцці пісьменніка.

Фэрнанду Пэсоа памёр амаль невядомым 30 лістапада 1935 года, надрукаваўшы толькі адну кнігу на партугальскай мове — «Пасланне» (Mensagem) і пакінуўшы вялікую спадчыну вершаў і лістоў, якія да гэтага часу даследуюцца і рыхтуюцца да друку. На падставе біяграфіі і твораў пісьменніка створаныя раманы «Год смерці Рыкарду Рэйша» Жазэ Сарамагу і «Тры апошнія дні Фэрнанду Пэсоа» Антоніё Табукі.

Сам Фэрнанду Пэсоа наконт сваёй біяграфіі выказваўся так: «Калі пасля таго, як я памру, нехта захоча напісаць маю біяграфію, няма нічога прасцей. Вось дзве даты — майго нараджэння і маёй смерці. Усё астатняе належыць мне».



Апошні карабель

Пад сонцам плачу, з каралём-бадзягам,
Апошні карабель пад гордым сцягам
Айчыны
За вечны далягляд сыходзіў з дому,
Самотна, не адкрыўшы анікому
Прычыны.

Сыйшоў. І вось назад прыйсці не можа —
З якіх краёў якога падарожжа
Без межаў?
Што здарыцца, для Бога ўжо існуе,
Ды хто адкрые выспу незямную
Відзежаў?

Чым сухапутней мой народ-зняверца,
Тым атлантычней плешчуцца
мне ў сэрца
Прылівы —
У моры, дзе няма прасторы з часам,
Дзе я з табой сустрэнуся сам-насам,
Шчаслівы.

Аднойчы кінеш якар проста ў неба,
Таму, што аніякае не трэба
Прычыны —
Табе, што быў душы маёй працягам,
Мой вечны карабель пад вечным сцягам
Айчыны.

Аўтапсіхаграфія

Паэзія немінуча
Пад маскай хавае боль:
Калі насамрэч балюча,
Прыдуманы плач ёй дазволь.

А што чытачы? Балець ім
Да слёз не тымі двума
Тваімі будзе, а трэцім,
Якога ў вершы няма.

Так круціцца па-вар'яцку
І плача слязой чужой
Катрынка, машынка, цацка,
Што людзі завуць душой.

***

Калі разышліся госці,
Бо ночы прыйшла чарга,
У цёмных прысадах парку
Між ценяў сустрэліся двое:
Я сам — і мая туга.

Замоўкла чужое свята
З прамовамі і гульбой,
І ў цёмных прысадах парку
Між ценяў сустрэліся двое:
Я колішні — з новым сабой.

Усім усяго было досыць,
Ды зноў па шчасце бяжым...
А ў цёмных прысадах парку
Між ценяў сустрэліся двое:
Я свой — са мною чужым.

Забытае свята аднойчы
Ўваскрэсіць свет-жартаўнік,
Ды ў цёмных прысадах парку
Між ценяў сустрэнуцца двое:
Я знікны — з тым, што не ўзнік.

***

О, звон маёй роднай вёскі,
Маркотны звон у сутонні, —
Твой гук душу развярэдзіць,
І сэрца ў смутку патоне.

Так шмат нясеш чалавечай
Журбы без канца і краю,
Што з кожным ударам плач твой
Угадваю й паўтараю.

І колькі б ні чуў, калі я
Праходжу, блукаючы, міма, —
Ты сну забытага рэха,
Шчаслівай душы радзіма.

Плывеш у адкрытае неба
І сумнай дрыготкай нотай
Звініш, як далёка былое,
Як блізка туга з адзінотай.

***

Калі фрэгат хаваюць гарызонты,
Не сам ён гіне, толькі сілуэт.
Душа сыходзіць —
плакаць наўздагон ты
Не мусіш. Ты скажы:
«Плыве ў сусвет».

Вось сімвал усяго,
што стаіца можа, —
Быццё й нябыт,
як рух вакол зямлі:
Жыццё па кругасмертным
падарожжы
Вяртае душы, быццам караблі.

***

Хто раскажа, як тоне
Сэрца ў смутку балючым,
У бязмежным бяссонні
З безнадзейным бязгуччам?

Толькі боль усяночны,
Толькі жаль невыплачны,
Што, як неба, відочны
І, як неба, нябачны.

***

Дваровы кот, што ў траву
Сігае мурзатым носам,
Я горшым лёсам жыву,
Бо твой — не завецца лёсам.

Ты ў свеце маленькі госць,
Як людзі, дрэвы й каменні,
Ды ўсё, што ў цябе тут ёсць, —
Тваё — ні болей, ні меней.

Ты ўвесь — на гэтай зямлі
Істотай сваёй зямною.
А я — ці жыў тут калі?
Я ёсць, але хто ёсць мною?

***

Месяц, кажуць брытанцы,
Зроблены з сыру зялёнага.
Думка кружыць у танцы
Вечнага і бясплённага.

Вось яна, тут — і знікла...
Верым лятункам, зданям...
Бег ад болю, што звыкла
Людзі завуць «жаданнем».

Буру жаданняў у шклянцы
Інтэлекту не спынім.
Месяц, кажуць брытанцы,
Часам бывае сінім.

***

Так шмат дажджу з нябёсаў шэрых,
Што сэнсу больш няма нідзе.
Маркота размывае бераг,
І ў кожнай думцы дождж ідзе.

На мове восеньскага плачу
Ўсяго, што кроіць мне душу,
Не выслаўлю й не растлумачу,
Бо сам не знаю, дзе схлушу.

Бо сам не ведаю, ці дрэнна
І ці магчыма з гэтым жыць.
А дождж ідзе, ідзе сумленна,
Як прывітанне ад Верлена, —
І сэрца плача і дажджыць.

***

Смерць хутка расставіць кропкі,
Жывём за крок да фіналу.
Імгненні жыцця — падробкі
Забытага арыгіналу.

Любоў прыходзіла госцяй
У недасканалы свет,
І хто дасягаў чагосьці —
Не ведаў сапраўдных мэт.

А смерць вядзе картатэку
І крэсліць слова па слове
У дзённіку чалавека,
Што Бог разгарнуў на палове.

Пераклаў з партугальскай
Андрэй Хадановіч



Дзед Бронік любіў светлыя капелюшы і кашулі вышыванкі, а яшчэ ён любіў мяне — нэндзу ўнука Валодзю. Койданава. 1964 год

Айчым

Словы пра айчыма маёй маці — Браніслава Кісяля, майго дзеда Броніка



Адам ГЛОБУС

Сваякі

Даўно няма ні майго дзеда Броніка, ні бабы Ядзі, ні таты, ні маці... Часам я іх сустракаю ў снах, а здараецца, што нехта з родных нябожчыкаў зірне на мяне з люстэрка. Ад такіх позіркаў робіцца вусцішна. Атрымліваеш такое сабе прывітанне з іншасвету. Сэрца спыняецца. На скронях выступае халодны пот. Ты збіраешся нешта-нейкае кінуць у адказ, але не паспяваеш. Прывід змяняецца тваім будзённым адбіткам. Страх выветрываецца. Мыеш твар прахалоднай вадою і жывеш сабе далей, пакуль нехта зноў не зірне на цябе з люстэрка, каб нагадаць пра хуткаплыннасць усяго існага.

Тактоўнасць

Быць заможным у цяперашні час — мець грошы. У маім дзяцінстве грошаў, як капіталу, не было. Ад сваёй бабы Ядзі я чуў такія развагі пра заможнасць: «Валодзя, ты — багаты чалавек; у цябе ёсць два дзяды — Бронік і Ладзімер, і дзве бабы — Ядвіга і Браніслава!» Далёка не кожны з маіх раўналеткаў меў столькі жывых сваякоў, бо вайна пазабірала шмат каго з нашых дзядоў і баб. Я верыў сваёй бабе і ганарыўся багаццем. Веру ў такое багацце і цяпер.

Зварот

Да дзеда Броніка я заўсёды звяртаўся толькі на «Вы». Да ўсіх сваіх баб і дзядоў я толькі так і звяртаўся. Ніякіх там «ты» і блізка не гучала. З дзедам Бронікам гісторыя звыш асаблівая і далікатная, бо ён даводзіўся айчымам маёй маці. Само слова «айчым» у нашым доме не гучала. Наогул у беларусаў яго мала дзе прамаўляюць, а калі і кажуць, дык сцішана, амаль шэптам, бо гэта таямніца, пра якую чужым людзям і дзецям ведаць не трэба. Для мяне айчым маці заўсёды быў любімым дзедам Бронікам, бо я для яго доўгі час быў адзіным любімым унукам. Для маёй бабы Ядзі ён быў Бронюсям, Бронікам, Браніславам. Для цёткі Рэні і дзядзькі Антона — татам, татулечкам, бацькам. Для прабабы Мані — сынам, сыночкам, зноў жа Бронюсям.

Чамаданчык

Дзед Бронік ездзіў у госці з невялічкім чорным чамаданчыкам. Ён збіраў у яго самыя простыя мястэчковыя пачастункі: кавалак сала, яблыкі і бутэльку з самагонам. Бутэлька — для мужчын, сала — для жанчын, яблыкі — для дзяцей. З напакаваным чамаданам Бронік адведваў сталічных сваякоў і знаёмых. Аднаго разу ён патэлефанаваў з Койданава і паабяцаў прыехаць у нядзелю да мяне ў Мінск. Цэлую раніцу я прасядзеў каля акна, выглядаючы праз халодную шыбу свайго дзеда Броніка на тралейбусным прыпынку. Мы жылі на восьмым паверсе. З акна было добра відаць, як «трынаццаты» тралейбус спыняецца і з яго выходзяць пасажыры. Не ведаю, колькі разоў «трынаццатыя» расхінулі на прыпынку «Вінзавод» складныя дзверы, але я ўсё ж пабачыў, як з іх выходзіць Бронік з чорным чамаданчыкам. Дзед насіў чорнае скуранае паліто і чорны капялюш. Тады мне хацелася хутчэй вырасці, каб набыць такое ж скуранае паліто і такі ж маленькі, але пакоўны чамаданчык. Паліто са скуры я яшчэ паспеў панасіць, а чамаданчыкі выйшлі з моды незваротна. Цяпер усё больш заплечнікі ў людзей ці вялікія чамаданы на колцах. Дзедаў чамаданчык з самагонам, салам і яблыкамі застаўся адно ў салодкіх успамінах пра часы майго далёкага маленства.

Пепка

Дзед Бронік быў патомным сталяром. У спадчыну ад свайго бацькі Ваці ён, напалам з братам Казікам, атрымаў выдатна ўпарадкаваную сталярную майстэрню, поўную добра высушанага дрэва і розных фуганкаў з гэблікамі. Варштаты і ціскі, сякеры ды нажоўкі, кіянкі і малаткі прысутнічалі ў маім маленстве ад самага нараджэння. Водар свежых габлюшак і смалісты пах пілавіння заўсёды радавалі мяне. На сур'ёзную працу мяне і цяпер натхняе прыказка, якую паўтараў дзед Бронік, калі заходзіў у майстэрню і пачынаў нешта-нейкае рабіць: «Майстар Пепка робіць крэпка!». Прыказка пра Пепку паўтаралася пад нізкай столлю мястэчковай майстэрні шматкроць. Паўтаралася яна ў дзедавай майстэрні, паўтараецца і ў маёй, бо сапраўды дапамагае настроіцца на працу і на ёй засяродзіцца.

Басаножкі

У дзеда Броніка быў жаночы памер нагі. З такімі жаночымі ступакамі ён і пратупаў праз тры вайны, а калі вярнуўся ў Койданава, дык яго невялічкія ступакі напоўніцу выкарыстоўвалі нашы жанчыны. Дзед Бронік разношваў новы абутак сваёй жонкі і дачкі. Пасля вайны доўгі час з абуткам было кепска. Яго было не дакупіцца. Хапалі тое, што выкідалася на прылавак. Часам бралі туфлі не ў памер. Было смешна глядзець, як дзед разгульвае па хаце ў жаночых туфліках. Асабліва помняцца белыя басаножкі, што набылі для Рэгіны. Радасная, яна абула новенькія басаножкі, пабегла ў іх у горад і пасцірала ногі да крывавых пухірыстых мазалёў. Рэгіна дэманстравала мазалі і плакала. Дзед суцяшаў яе і разгульваў каля печы ў белых басаножках...



Браніслаў Кісель з сястрою Каміляй і яе мужам спадаром Голубевым. Магілёў. 1939 год

Каса

Рэня насіла касу. Русая, важкая, доўгая — ажно да самай дупы — каса была сямейнай каштоўнасцю. Рэніну касу ўсе любілі і нахвальвалі. Сімвал жаноцкай прыгажосці, сімвал цнатлівасці і чысціні, сімвал нашай агульнай надзеі — не менш. Каса патрабавала догляду. Рэня мыла валасы ў мяккай дажджавой вадзе, Рэня апаласквала валасы вадой з калодзежа, Рэня расчэсвала валасы вялікім грабенчыкам, Рэня заплятала касу і ўпрыгожвала яе бавоўняным ружовым бантам. Усё гэта было важным. Усё гэта радавала вока. Усё гэта стварала непаўторную атмасферу нашага койданаўскага дома. Рэня адрэзала касу, калі паступіла ва ўніверсітэт і сабралася перабрацца з Койданава ў Мінск. Касу адразалі ў койданаўскай цырульні. За касу нават нейкія грошы заплацілі. Толькі гэтай грашовай кампенсацыі было замала, каб суцешыць нашу сям'ю. Без Рэнінай касы мы ўсе нібыта асірацелі. Больш за іншых перажываў Бронік. Ягоная маленькая дачушка вырасла, зрэзала касу і паляцела з бацькоўскага гнязда ў вялікі свет. У дзедавай шафе засталіся рознакаляровыя стужкі, з якіх Рэня завязвала на касе банты. Пакуль Бронік быў жывы, ён нікому не дазваляў прыбраць гэтыя напаміны пра дзяцінства і юнацтва ягонай Рэні, ягонай Рэгіны Браніславаўны.

Машынка

У дзеда Броніка была выдатная машынка для стрыжкі валасоў. Жартам Бронік казаў, што не дарэмна прайшоў тры вайны — польскую, фінскую і нямецкую, бо на салдацкіх галовах ён добра навучыўся цырульніцтву. Калі дзед некага стрыг, дык з-пад ягонай машынкі выходзілі акуратныя салдаты. Нават з нас — дзяцей — бронікава машынка рабіла такіх сабе акуратных навабранцаў. Так склалася, што я ўсё жыццё карыстаюся паслугамі добрых цырульнікаў і наведваю найлепшыя ў Мінску цырульні «Нажнічкі», «Чарадзей» і «Новы вобраз». Я стрыгуся разам з міністрамі і дыпламатамі, але з цырульні выходжу падобным да вайскоўца, выходжу такім, нібыта мяне пастрыг усё той жа дзед Бронік.

> **На сур'ёзную працу мяне і цяпер натхняе прыказка, якую паўтараў дзед Бронік, калі заходзіў у майстэрню і пачынаў нешта-нейкае рабіць: «Майстар Пепка робіць крэпка!»**

Рыскі

Дзед Бронік у сваім доме падводзіў мяне — хлопчыка — да блакітных дзвярэй, казаў, каб я прытуліўся плячыма да касяка. На маё цемя клалася металічная лінейка. На блакітным касяку з'яўлялася танюткая рысачка, побач з якой прастаўлялася дата. Усе прысутныя радаваліся, што я крыху падрос. Так я і вырас каля блакітнага касяка ў доме дзеда Броніка і бабы Ядзі. Да таго дома ў маёй душы захоўваецца нязменная любоў. Новыя гаспадары шматкроць перафарбоўвалі касяк. Цяпер ён цёмна-белы. Ягоны колер падобны да колера касяка ў маёй мінскай кватэры. Касяка, да якога я зрэдку падводжу ўнука Валодзю, каб пазначыць рыскай ягоны цяперашні рост. Вова расце каля майго цёмна-белага касяка. Спадзяюся, у ягонай душы захаваецца любоў да маёй кватэры і нашага дома на вуліцы Чырвонай.

Вада

Дзед Бронік заўсёды мяне, свайго старэйшага ўнука, нечаму ды вучыў. Ён вучыў абкопваць яблыні, вучыў падвязваць кусты агрэсту, вучыў рабіць прышчэпкі на грушах і слівах, вучыў замазваць варам расколіны на кары ў маладой вішні. Вучыў ганарыцца нашымі бэрамі, лімонкамі ды бура́чкамі — найсмачнейшымі грушамі. Дзед вучыў рваць кроп і цыбулю ў гародзе. Вучыў збіраць грыбы і маліну ў лесе. Я быў стараным вучнем, быў малым, любімым і паслухмяным, ажно пакуль не стаў дарослым. Баба Ядзя папрасіла свайго Броніка схадзіць па ваду. Ён зіркнуў у мой бок і сказаў:

Працяг на стар. 16 (10) »

« Працяг.
Пачатак на стар. 15 (9)

«Валодзя пойдзе і прынясе. Ён у нас дарослы!» Ваду ў хату мы прыносілі з вулічнай калонкі. На нейкі момант падалося, што баба Ядзя абароніць мяне ад гэткай раптоўнай дарослаці, а яна не абараніла, сказаўшы: «Не набірай поўнае вядро. Набяры палову. Лепш два разы схадзіць, чым, ідучы, паабліваццa...»

БССР

Размовы пра аднаўленне СССР мяне напружваюць. Ніякага сутнаснага адраджэння не прадбачыцца, бо ніхто не збіраецца нават на словах вярнуць зямлю сялянам, а заводы — рабочым. Ніхто і паўслова не кажа пра малапатрэбнасць і шкоднасць царквы ды рэлігіі наогул. Ніхто не згадвае і супольнасць людзей, якую некалі называлі савецкай. Які Савецкі Саюз без усяго такога і да такога падобнага? Замест савецкай супольнасці прапануецца рускі свет і расейскі парадак. Парадку ў Расеі няма; дарэчы, яго там ніколі і не было. Рускі свет, дзе галоўнымі ворагамі абвешчаны ўкраінцы і палякі, а ў браты-сябры паназапісаны найміты і радзімапрадаўцы з Каўказа, непрывабны і нежыццестваральны. Добра, што мяне выхоўвалі людзі, якія не любілі СССР. Мая сям'я моцна пацярпела ў савецкі час. Маёмасць забралі. Мужчын выслалі пад Архангельск, а потым пагналі на вайну. Дзед Бронік прайшоў шмат ваенных дарог: вызваляў Беларусь на вайне Польскай, пакутваў на Фінскай і атрымаў разрыўную кулю ў жывот на Нямецкай. Ён мяне навучыў прачытваць абрэвіятуру БССР як «Бацька Сера — Сын Рагоча!». СССР прачытвалася яшчэ больш злосна — «Сталін Сера — Сын Рагоча!». Так ставіліся да абрыдлага Саюза ў маёй сям'і. Так наш народ ставіўся да СССР. Ставіўся з нянавісцю і чорным гумарам.

Сто грамаў

Больш за ўсіх астатніх пра вайну мне — школьніку — панарасказваў Бронік. Амаль усе ягоныя апавяданні падаваліся смешнымі. Разам з дзедам я смяяўся: з фінскіх лыжнікаў, падобных да чарцей, з польскіх кулямётчыкаў, што не маглі трапна страляць, з рускіх пехацінцаў, якія гінулі, бо ішлі ў бой п'янымі... Шматкроць паўтаралася апавяданне пра франтавыя сто грамаў гарэлкі, якія нельга піць перад боем, калі ты хочаш вярнуцца з вайны жывым. Дзед Бронік казаў, што я павінен аддаваць сваю гарэлку іншым, аддаваць тым, хто баіцца. Лепш проста незаўважна выліць гарэлку на зямлю, чым піць перад боем. Ваяваць трэба з яснай галавою. Так вучыў мяне Бронік, які прайшоў не адну вайну і вярнуўся ў сваё Койданава.

Пудзіла

У нашым койданаўскім садзе я любіў амаль усё. Ведаў назву кожнай яблыні і грушы. Дапамагаў абіраць агрэст, смародзіну, парэчку. Каля плоту збіраў спелы боб. Калі вішні толькі-толькі пачалі жаўцець-ружавець, баба Ядзя папрасіла Броніка, каб зрабіў пудзіла. Я дапамагаў дзеду рабіць пудзіла з чорнага бабінага жакету. Дзед збіў крыжавіну з рэек, начапіў на яе жакет і зашпіліў на ўсе гузікі. Галаву жакетнаму пудзілу мы зрабілі са старой прасціны, галава атрымалася маленькай і крывой. Дзед Бронік прымацаваў крыжавіну дротам да галіны так, што пудзіла ўзнялося высока над дрэвам. Нават самы слабы ветрык хістаў пустыя рукавы жакета, таму наша белагаловае пудзіла несупынна размахвала рукамі. Яно абараніла ўраджай вішан, і мы іх пазбіралі ў бідончыкі ды ў тазіку зварылі. Звычайная справа — зрабіць пудзіла і ўзняць яго над вішнёвым дрэвам. Толькі ў маёй душы пудзіла нараджала страх. Нават не само пудзіла, зробленае са зношанага жакета, а крыкі спалоханых птушак. Пудзіла ўзмахвала пустым рукавом, пераляканая птушка ўскрыквала, і страх ахопліваў душу. Калі мы разлілі вішнёвае варэнне па слоіках, баба Ядзя папрасіла зняць пудзіла. Я дапамог дзеду Броніку разабраць пудзіла, і разам з суседскімі дзецьмі спалілі яго за могілкамі, у паўразбураным ДОТ-е.



Вялікая сям'я: дзед Бронік, баба Ядзя, унук Валодзя, маці Ніна, цётка Рэгіна, дзядзька Антак, тата Чэсь. Койданава. 1964 год

Нёман

Пасля вячэры я з дзедам Бронікам сядзеў за сталом, пакуль баба Ядзя мыла посуд. «Як там ваш Мінск?» — дзед Бронік заўсміхаўся, бо я мусіў на заўсёднае пытанне сказаць, што ў Мінску дождж ідзе, а ў Пінску слізка. З гэтага жарціка пачыналіся нашы размовы. Такая мелася завядзёнка. «Што ты парабляеш?» — папытаў Бронік. «Плаваць вучуся. Магу праплыць пяцьсот метраў, магу з вышкі дзесяцімятровай скокнуць. Мне далі бясплатны абанемент на паўгода...» — «Нёман пад Стоўбцамі зможаш пераплысці?» — «Лёгка. Нёман пад Стоўбцамі я ўжо пераплываў. Мы з маці ездзілі на радзіму Коласа. Будаўнічы трэст, дзе маці працуе, арганізоўваў вандроўку. Пакуль усе вячэралі каля вогнішча, я схадзіў на Нёман і пераплыў яго двойчы. Плынь моцная, але далёка не знесла...» — «Маці ты не казаў?» — «Яна ўбачала, што галава мокрая. Насварылася, бо адзін купаўся. Пра пераплыванне рэчкі я не стаў расказваць, бо насварылася б яшчэ больш...» — «Я плаваць зусім не ўмею. У мяне галава цяжкая, а дупа лёгкая. Зайду ў ваду — дупа ўсплывае, а галава на дно ідзе. Каля рэчкі Рудзіцы вырас, а плаваць не навучыўся. Не любяць мяне рэчкі, і я іх не люблю. Аднаго разу няўменне плаваць мяне нават выратавала. Загадалі нам пераправіцца праз рэчку і захапіць груды за ёй. Ротны казаў, што возьмем мы зарэчныя высоты, і будзе нам рай на зямлі. Так мы яму і паверылі, пустабрэху. Вайна — суцэльнае пекла. Пачалася атака. Рэчка не шырокая трапілася, якраз такая, як Нёман пад Стоўбцамі. Нашы пачалі пераходзіць і пераплываць рэчку, а я зайшоў у ваду, прысеў каля берага, схаваўшы галаву за корч. Так і прасядзеў, ажно пакуль страляніна не скончылася. Потым выбраўся на бераг. З хлопцамі з чужой роты пераплыў рэчку на чаўне. З нашай роты амаль нікога цэлага і не засталося; хто загінуў, каго параніла, а каго кантузіла. Так што, унук, загадаюць табе браць высоты за рэчкай, а ты не спяшайся. Пасядзі за карчом, і цалейшы будзеш. У нашай мужчынскай справе галоўнае — не пайсці на вайну, а вярнуцца з вайны. Я тры вайны прайшоў і вярнуўся, а плаваць вось яшчэ не навучыўся. Летам з'ездзім на рэчку, завядзем матацыкал і паедзем на Нёман, і ты мяне навучыш плаваць «па-сабачы». Навучыш?» — «На Нёмане? Па-сабачы? Навучу!»

Размовы пра аднаўленне СССР мяне напружваюць. Ніякага сутнаснага адраджэння не прадбачыцца, бо ніхто не збіраецца нават на словах вяртаць зямлю сялянам, а заводы — рабочым. Ніхто і паўслова не кажа пра малапатрэбнасць і шкоднасць царквы ды рэлігіі наогул. Ніхто не згадвае і супольнасць людзей, якую некалі называлі савецкай

Здароўе

Баба Ядзя памірала ад раку. Памірала пакутліва. Мне хацелася адшчыкнуць ад сябе крыху здароўя, кавалачак жыцця і перадаць іх бабе Ядзі. Пэўна, і Броніку хацелася падоўжыць жыццё жонкі — ягонай любай Ядзі. Яна памерла. Броніка разбіў інсульт. Мне было шкада нашага дзеда Броніка, але не было ў мяне жадання перадаваць сваё здароўе дзеду. Мусіць, ні з кім, акрамя бабы Ядзі, я і не хацеў так моцна і так адчайна падзяліцца ўласным жыццём.

Рублі

У час нашай апошняй сустрэчы дзед Бронік амаль не гаварыў. Ён паспрабаваў мне нешта-нейкае сказаць, але ў ягоным буркатлівым мармытанні я не змог разабаць словаў. Яны ўсё скамечваліся ў гукавую кашу. Пра такое якраз і кажуць — каша ў роце. Пасля некалькіх няўдалых спробаў загаварыць Бронік дробнымі крокамі накіраваўся са спачывалькі ў варэльню, дзе адчыніў буфет і дастаў з драўлянай скарбонкі тры рублі адной паперкай. Дзед Бронік аддаў мне тыя рублі. На маё пытанне «Вам трэба нешта купіць і прынесці?» ён адмоўна захітаў галавою, заплюшчыў вочы і выразна сказаў: «Гэта табе...». Такімі былі апошнія словы, якія я пачуў ад дзеда Броніка. Для мяне — сямікласніка — тыя тры рублі адной зялёнай паперкай былі вялікім падарункам. Дзедаў падарунак лёг у капэрту, у якой збіраліся грошы на новы ровар.

Сон

Бабу Ядзю пахавалі без мяне. У той дзень я быў у летніку «Зялёнае», што пад Мінскам. Маці нават не сказала, што з'едзе на пахаванне. З-за гэтага я моцна пасварыўся з бацькамі. Апошні месяц Ядзя пражыла ў нашай мінскай кватэры. За тыдзень да смерці яе перавезлі ў Койданава. Я перажываў, што не змог развітацца з любімай бабай Ядзяй. Таму праз два гады мяне ўзялі на пахаванне дзеда Броніка. Я сядзеў каля труны і глядзеў на цёмную дзедаву скронь. Ён памёр ад кровазліцця ў мозг. Скронь і патыліца былі амаль чорныя ад крыві. Не плакаў, бо казаў сабе, што наш дзед Бронік спіць і не можа прачнуцца. Ён не памёр, а заснуў. Цяпер ён будзе спаць у залатым пяску на новых могілках каля льнозавода. Дзеда Броніка пахавалі побач з бабай Ядзяй. Пасля пахавання дзеда Броніка я перастаў перажываць з-за таго, што не праводзіў у апошні шлях бабу Ядзю.

Месца


У Броніка мелася сваё ганаровае месца за сталом. Ён заўсёды сядаў толькі на яго. І раніцай, і ўдзень, і ўвечары дзед сядзеў у тарцы стала, пад календаром. Я садзіўся або леваруч ад дзеда, спінай да печы, або праваруч — спінаю да акна. Выпадковыя госці сядалі насупраць дзеда Броніка, спінаю да дзвярэй. Такі меўся парадак у нашай хаце, і яго ніхто не парушаў. Дзедава месца заўсёды было дзедавым месцам. Калі Бронік памёр, месца перайшло да ягона сына Антона. Калі Антона не стала, на галоўным месцы сядзела Антонава жонка — Ніна. Цяпер, калі Ніна хварэе і амаль не падымаецца з ложка, на дзедавым месцы сядзіць унук Ніны, ён таксама Антон. Для мяне, тое месца ў тарцы стала, пад адрыўным календаром, усё яшчэ месца дзеда Броніка, такім яно і застанецца назаўжды.

Рай

Ёсць безліч розных апісанняў жыцця ў раі. Борхес разам з Касарасам склалі з такіх апісанняў «Кнігу пекла і рая». Я паспрабаваў там знайсці рай, які падыходзіў бы для мяне ці хоць крыху адпавядаў маім уяўленням і снам пра светлы кут. Не знайшоў. Мне бачыцца зусім іншым мой персанальны рай... Першая сустрэча, якая здарыцца пасля смерці, будзе з Бронікам і Казікам — Кісялямі. Яны, маладыя, у белых кашулях і цёмна-сініх галіфэ, парыпваючы добра наваксаванымі чорнымі ботамі, падыдуць да мяне і абдымуць. Мне, як і братам Кісялям, будзе гадоў дваццаць. Утрох мы пойдзем да Казіка. У ягонай хаце нас чакае накрыты стол з выпіўкай і закускамі. За тым сталом ужо сабраліся дарагія дзяды з бабамі, маці з бацькам, дзядзькі ды цёткі. Мы будзем святкаваць нашу сустрэчу. Нам радасна. У казікавай хаце мы паадчыняем вокны. На вуліцы сонечна, свежа і цёпла. У маім персанальным раі вечная нядзеля і заўсёды раніца траўня. Галоўны чалавек у раі — айчым маці, мой дзед Бронік, — малады мужчына ў галіфэ. Забыўся сказаць пра лёгкі ветрык. Ён там ёсць. Каб яго адчуць, варта заплюшчыць вочы. Ты заплюшчыў вочы, адчуў тварам травеньскі ветрык і пачуў, як за вокнамі ў садзе ціха гудуць пчолы.

Змест і яго сутнасць

Выйшаў юбілейны — 100-ы — нумар часопіса «Дзеяслоў». Веха ў літаратурным жыцці і сучасным творчым працэсе ў беларускай літаратуры знакавая і заўважная.



З гэтай нагоды ва ўступным слове ад імя рэдакцыі шэф-рэдактар часопіса **Барыс Пятровіч**, успамінаючы няпросты шлях незалежнага літаратурна-мастацкага выдання, смела заяўляе *«з абсалютнай упэўненасцю, што гэты час і гэты лад не назаўсёды, што тыя, хто быў разам з намі ўсе гэтыя 100 нумароў, выстаяць і надалей застануцца вернымі роднай зямлі, роднай мове і дэвізу, агучанаму ў 1-м нумары: жыццё кароткае — Радзіма вечная!»*

А публікацыі юбілейнага нумара адкрывае знаны паэт **Алесь Разанаў** сваімі філалагічна-філасофскімі развагамі (*зномамі*) — пра мову, культуру, Айчыну, творцу-асобу і пісьменніцкае мастацтва... Тлумачэннем творчага, як набліжэннем да існага... Сярод глыбокага, запамінальнага ды іскрамётнага і такое: *«Калі мастакі падаюцца ў палітыку, яны пачынаюць маляваць анекдоты — карыкатуры. Так, гэта карыкатуры на нешта, што пазнаецца, і разам з тым на тое, што пазнавацца не хоча, — на самое мастацтва». Альбо гэтае, важнае для нашай нацыянальнай самасці: «Змест мовы не ў самой мове, а ў тых, хто на ёй гаворыць і думае. Забіраецца змест — нямее мова, удыхаецца змест — нават нямое набывае мову»*.

Знакавай і выбітнай публікацыяй нумара, безумоўна, з'яўляецца аповесць **Барыса Пятровіча** «Засада, альбо Лавіся рыбка вялікая». Сюжэт насамрэч вельмі просты, але ў гэтай прастаце схаваная ўся складанасць нашага цяперашняга нацыянальнага жыцця. Калі коратка: пасля чарговых вулічных пратэстаў апазіцыі як заўсёды адбываецца АМАПаўска-МУСаўскі хапун найбольш «адмарожаных» і небяспечных. У сталічнай кватэры па наводцы і павінны былі вылавіць аднаго з галоўных кіраўнікоў апазіцыйнага руху. Аднак той паспеў сыйсці адтуль загадзя. І ўсё ж кватэру блакуюць, чакаючы прыходу «злачынца», і пры гэтым затрымліваюць больш чым на суткі ўсіх тых, хто з нейкіх прычын звоніцца ў тую «крымінальную хату» (ад суседзяў да школьнікаў і сантэхнікаў). Па сутнасці, постсавецкая сталічная кватэра ператвараецца ў турэмную камеру часовага затрымання. *«Каму цікава назіраць, як людзі ператвараюцца ў быдла?Хіба толькі таму, хто гэта робіць. Няважна дзе: на Кубе, у Бірме, Кампучыі, Паўночнай Карэі ці тут. Але чаму ён не думае пра будучыню? Не сваю, а свайго народа? Ды таму не думае, што ў яго па-за ім самім будучыні няма... Увесь гэты свет ёсць, пакуль ёсць ён сам. І галоўная задача ўтрымацца пры ўладзе максімальна — пажадана да смерці. Каб памерці ад старасці. А не ад кулі ці атруты. І ўсё робіцца дзеля гэтага. Знішчаюцца ворагі і сябры , прыніжаецца, ператвараецца ў статак народ»*.

Пры ўсім пры тым трэба разумець, што людзі, заблакаваныя і зняволеныя ў кватэры без аніякага супраціву і пратэсту. Яны знаёмяцца між сабою, стасуюцца, распавядаюць дзіўныя гісторыі ўласных жыццяў... Паступова ў кантэксце расповеду агаляюцца карані найбольш хібных рысаў нашай ментальнасці — боязі, страху, абачлівасці, падпарадкавання і цярплівасці... Падчас расповеду пісьменнік набліжаецца да афарыстычных оруэлаўскіх узораў пісьма: *«Страх і нянавісць ходзяць побач. Але ўладары кажуць: няхай яны нас ненавідзяць, але баяцца. Бо няма ў дыктатараў больш магутнае зброі, чым страх. «Дайце мне магчымасць запалохаць людзей, і я буду вяроўкі з іх віць», — кажа дыктатар. І палохае». А ўжо сам «страх спараджае пакору. Пакора — абыякавасць. Абыякавасць — бяздзеянне. Бяздзеянне — рабства. Рабства трымаецца на страху, які спараджае пакору»*.

На мой погляд, творца, без напругі і красворднай заблытанасці, мінімалістычнымі мастацкімі сродкамі паспрабаваў вызвяць нашу нацыянальную сутнасць. Асабліва ўражвае вобраз бабулі-бамжыхі напрыканцы аповесці, якая нечым нагадвае агульны стан нашай сённяшняй краіны. Усе падумалі, што яна сканала ў гэтай кватэрнай вязніцы, а *«бабулька спала... І цяпер здавалася яна зусім не страшнай бамжыхай, як падумалася спачатку, а малым заснулым дзіцём, якое стамілася ад разумоў дарослых. І хай недзе ў свеце адбываюцца рэвалюцыі ці эвалюцыі, плошчы ці майданы, войны ці палёты на Месяц і Марс, яна будзе спаць... І нішто, і ніхто яе не разбудзіць. Бо толькі тут і толькі цяпер яна адчула сябе абароненай. Няма побач сына — п'яніцы і гвалтаўніка. Няма клопату, як пракарміцца. Ёсць цяпло і спакой. Ёй так добра, быццам яна і сапраўды памерла. Што яшчэ трэба для шчасця?»*

Таленавітая проза, вартая ўдумнай і грунтоўнай увагі літаратурнай і чытацкай грамадскасці.

Следам друкуюцца вершаваныя і празаічныя лісты паэта **Уладзіміра Някляева** да жонкі Вольгі пад агульным назовам «Калі мяне не стане». Перад намі праявы высокай душэўнай лірыкі, калі ў змаганні за волю гартуецца і сцвярджаецца каханне да Волі. Нейк так прачытваецца паэтычны *ліст да Вольгі*, што падаецца як прадмова да публікацыі турэмных лістоў да яе. У Някляева ўсё адмыслова, тэатральна ўзвышана, дэкламацыйна прадумана і эмацыйна прачула:

Калі мяне не стане — ты жыві,
Забыўшыся, што я цябе пакінуў.
Я — у табе, я — у тваёй крыві,
А не ў халодных вежах успамінаў.
Не ў тых лістах, якія напісаў,
Не ў словах тых,
якія можна сцерці,
А ў той радзімцы,
што пацалаваў,
Упершыню ў сабе адчуўшы сэрца.

Леанід Дранько-Майсюк, таленавіты паэт, эсэіст, а з нядаўняга часу гісторык і даследчык беларускай літаратуры, працягвае публікацыю жыццяпісу і духоўнага служэння беларускага святара-каталіка, мовазнаўцы і грамадскага дзеяча Адама Станкевіча. Вартая праца, сярмяжная і цяжкая, скажам, у параўнанні з лірычнай творчасцю знанага паэта, якая заслугоўвае ўвагі і ўдзячнасці. Будзем чакаць заканчэння ў наступным нумары.

Нізка ўласных вершаў і перастварэнняў з сучаснай украінскай паэтычнай класікі **Міхася Скоблы** нібыта асабліва не розняцца мастацкім узроўнем і *вымагаюць* чытача любіць не чужое, як сваё, а ставіцца да свайго, як не да чужога... Годная літаратурная місія. А галоўнае, выдатныя вершы. Вось фрагмент аднаго з іх пад назовам «Патрыцый», у якім прачытваецца вобраз Міхася Стральцова:

Палічыць чаркі выпітыя чэлядзь
І выпытае факты звадыяш.
Ім хочацца патрыцыя знікчэмніць,
Каб па-плебейску выгукнуць:
ён — наш!
Ды што з таго, што выселены
з Рыма,
Ён садзіць бульбу ці гусей пасе...
Прысела вечнасць пад яго дзвярыма
І тогу вышывае пакрысе...

Пісьменнік **Сяргей Рублеўскі** друкуе два апавяданні. Адно на тэму літаратурнай творчасці і творчай дэпрэсіі і другое — пра смерць як істоту карную, што пераследуе чалавека наўсцяж яго жыцця... Ну і нельга абысці ў размове пра творчасць гэтага літаратара яго стаўленне да мовы. Яна ў яго цудоўная, а да таго ж у ёй шмат новых забытых намі мацярынскіх слоў (*корць, трэтар, барляць, скамшаць*). Як піша аўтар у аповедзе *«Я, мама і смерць у калідоры»: «Адным узмахам сваёй адмысловай касы смерць раптам пераразала пупавіну, якая злучала мяне з матулiным слоўным багаццем нягледзячы на тое, што словы ў гаворцы сашчыльнены, не раўнуючы як тыя імгненні...»*.

Як па ўсім вынікае з урыўка, новы раман **Андрэя Федарэнкі** «Літаў» будзе мецць палітычную ці ва ўсякім разе міжнацыянальна-грамадскую падаплёку. Магчыма, нават будзе акрэслены вектар глабалізма на фоне нашых усходне-еўрапейскіх узаемаадносін. Безумоўна, не без беларускага атожылка, які ў рэшце рэшт можа стацца адной з зеленеючых і жывых частак падсыхаючай кроны сусветнага дрэва...

Дэбютная проза клірыка Свята-Пакроўскага сабора **Паўла Каспяровіча** (апавяданне «Чорная рэчка») — гэта, па сутнасці, проза паэта пра пошукі яе слядоў у гісторыі. Сцісла, фактурна, стылёва-стрымана... Гэткі лірычна-вандроўны расклад творчага жыцця — ад трагічна-драматычных лёсаў літаратурных куміраў да ўласнага прагматычнага стаўлення да жыцця і творчасці...

Друкуюцца цікавыя самі па сабе некаторыя дзённікавыя запісы маладога **Анатоля Кудраўца** (другая палова 1960-х гадоў). Перад намі — праца маладога аўтара над першымі чарнавымі накідамі будучых празаічных твораў, набіццё рукі, стылёвыя штуды, а таксама некаторыя факты з тадышняга літаратурнага жыцця, начыркі прыватных стасункаў з асобнымі пісьменнікамі і сякія-такія зацемкі з грамадскіх праяў пасляхрушчоўскага часу.

У рубрыцы «Спадчына» публікуецца незавершаны трагіфарс у трох дзеях «Марш-кідок у Дурдуны» рана адышоўшага таленавітага і арыгінальнага пісьменніка і драматурга **Алеся Асташонка**. Творчая няўрымслівасць і пошукі новых літаратурных хадоў акрэслівалі яркі характар гэтага выбітнога аўтара. Папярэднік «бум-бамлітаўскага» шызарэалізму і некаторых іншых спраўджаных і схібленых літаратурных накірункаў у суверэннай нацыянальнай літаратуры. Тэкст, які друкуецца ў часопісе, будзе цікавы тым, хто не трывае творчага застою і прагне мастацкіх пошукаў і адкрыццяў любімі метадамі. Нездарма пісьменнік выносіць эпіграфам да адной з частак свайго трагіфарса фрагмент з «Вераснёвай ночы» Кузьмы Чорнага: *«І Асташонак нечага там трэцца ўсё. Але дзе ён не трэцца, куды ён не ўлезе, нідзе спакою не дасць. Ніякае сталасці не мае і, мабыць, чалавекам ніколі не будзе...»*. Раю пачытаць найперш людзям з адчуваннем гумару ды іроніі.

Вельмі шчырую гутарку публікуе Сяргей Шапран з лаўрэаткай Нобелеўскай прэміі па літаратуры **Святланай Алексіевіч**. Мяркую, прачытаўшы яе, у некаторых крытыкаў Святланы Аляксандраўны зменяцца адносіны да яе як да грамадскай асобы і выбітнага творцы. Погляды на стан развіцця сучаснага свету, на ўспрыманне і рэагаванне вонкавых дэмакратычных зрухаў у нашай краіне, на эвалюцыйныя працэсы і духоўную культуру чалавецтва, на ўплыў дакументальнай і мастацкай літаратуры на тыя працэсы, што ўдасканальваюць ці разбураюць альбо ўскладняюць сённяшнюю цывілізацыю — усё гэта тым ці іншым чынам прысутнічае ў кантэксце жывой і прыцягальнай гутаркі.


«...я шкадавала, што прэмію не атрымалі Алесь Адамовіч і Васіль Быкаў, што было б справядліва... Зрэшты, тут важна вось яшчэ што — каб цені вялікіх не прыгняталі, а, наадварот, давалі пачуццё свабоды. Каб яны спараджалі жаданне ісці далей і спрабаваць рабіць нешта іншае, новае, а не хадзіць па адным і тым жа коле, пастаянна натыкаючыся на саму сябе. Таму і хачу зрабіць вось гэтыя дзве кнігі: пра каханне і пра смерць. Мяне даўно цікавяць гэтыя метафізічныя, ірацыянальныя рэчы, якія мы не здольныя зразумець. Мне хацелася б ведаць, што сучасны чалавек думае пра гэта. Пра што ён здагадваецца? Чаго баіцца?І якія забабоны існуюць у гэтай сувязі ў нашым сённяшнім дні?..» Цытацыяй гэтага фрагмента я як бы звяртаю ўвагу чытачоў і міжволва рэкламую будучыя кнігі нашай знанай суайчынніцы.


Аўтар гэтага агляду друкуе сваё ліставанне з таленавітай паэтэсай **Нінай Мацяш** (1943–2008). Яны датычныя двух апошніх гадоў яе жыцця. Гэта вельмі шчырая і сумленная гутарка-палеміка двух літаратараў на адну дагэтуль недавырашаную балючую тэму нашага нацыянальнага духоўнага жыцця. Каб чытач прыкладна ўявіў напал гаворкі, прывяду адзін *з пісьмовых маналогаў* Ніны Язэпаўны: *«Прачытала ў «ЛіМе» Ваш водгук пра Сыса. У нас шчыльнае супадзенне мастацка-эстэтычных густаў: пералічанае Вамі лепшае ў зборніку і мне бачыцца найлепшым. А вось паасобныя Вашы меркаванні падаюцца мне спрэчнымі. Да прыкладу, разважанне аб прычынах непрыходу старэйшых развітацца* (рэч вядзецца пра пахаванне Анатоля Сыса і, прынамсі, развітанне з ім у Доме літаратара. — **ЛеГал**). *Ну якая тут магла быць зайздрасць, Лявоне?! Няўжо Вы ўсур'ёз думаеце, што прыжыццёвая «народная слава» Сыса грунтавалася на разуменні маладзевай публікай ягонай творчай геніяльнасці? Моладзь заўсёды гатовая руйнаваць усе каноны і аўтарытэты. Толя — малады, прыгожы, артыстычны — рабіў гэта прылюдна і безаглядна, з ім было цікава і весела — найперш гэткім жа маладым і ўсхмеленым уласнай жыццёвай моцай, гатовай пераварнуць свет. Ну, а калі ўжо на авансцэну выйшаў хмель іншага гатунку, думаеце, Толіку пляскалі ў ладкі за глыбіню вершаў? Так, нехта і за іх. Але большасці было зноў... толькі весела. Бо «сапраўдную мастацкую веліч» немагчыма ўбачыць ані ў п'яным абліччы, ані, пагатоў, у труне... І тое страшэннае няшчасце, якому папусціўся Сыс, ніякі не «мастацка-эстэтычны акт», Лявоне»*.

Да таго ж чытач знойдзе ў часопісе разгорнуты і грунтоўны артыкул **Анатоля Сідарэвіча** *«пра першыя крокі Беларускай сацыялістычнай Грамады на агульнарасійскай палітычнай арэне»*, выбранае *«з фэйсбучных запісаў»* **Сяргея Дубаўца**, развагі **Галіны Багданавай** пра творчасць мастачкі Алесі Скарабагатай, выбітныя *абышоскі* з жыцця сучасных беларусаў **Яўгена Рагіна**, а таксама рэцэнзіі Ірыны Саматой — на кнігу Яна Чыквіна «Трохкрылыя птушкі» ды **Леаніда Галубовіча** — на кнігу малой прозы Андрэя Федарэнкі «Сузіральнік».

Прыемнага чытання.

ЛеГал





Леанарда да Вінчы ў «вольным доступе»

Музей Вікторыі і Альберта (V&A) у Лондане аблічбаваў і выклаў у вольны доступ запісы італьянскага мастака, архітэктара, музыканта, вынаходніка, інжынера, скульптара і мысляра эпохі Адраджэння – Леанарда да Вінчы (1452–1519). Раней іх маглі бачыць толькі навукоўцы.

На сайце музея можна ў добрай якасці ўбачыць эскізы, планы, малюнкі, канцэпцыі, думкі, вынаходніцтвы і заўвагі вялікага генія.

Леанарда да Вінчы прызнаны адным з найвялікшых мастакоў усіх часоў і, магчыма, самым таленавітым чалавекам, які калі-небудзь жыў. Яго сшыткі ўтрымліваюць дыяграмы, малюнкі, асабістыя нататкі і назіранні, напісаныя ва ўнікальнай тэхніцы люстэркавага аркуша, вядомай таксама як «почырк Леанарда», даючы ўнікальнае ўяўленне пра тое, як ён бачыў свет. Пяць з гэтых неверагодных прадметаў знаходзяцца ў калекцыі музея.


На сайце музея пазначана: «Леанарда да Вінчы (1452–1519), вядомы ва ўсім свеце як мастак такіх шэдэўраў, як Мона Ліза, таксама вядомы сваімі сшыткамі, у якіх ён запісваў свае думкі і вынаходніцтвы. Пяць з гэтых займальных сшыткаў, злучаных у тры невялікія тамы, знаходзяцца ў нашай калекцыі з 1876 года, калі яны былі адпісаны музею Джонам Форстэрам. Усе разам вядомыя як «Кодэкс Форстэра», яны датуюцца прыкладна 1487–1505 гадамі і адлюстроўваюць надзвычай дапытлівы розум Леанарда.

Леанарда пачаў запісваць свае думкі ў сшытках з сярэдзіны 1480-х гадоў, калі працаваў ваенным і марскім інжынерам у герцага Міланскага. Ні адзін з папярэднікаў, сучаснікаў ці пераемнікаў Леанарда не выкарыстоўваў паперу так, як ён: адна старонка змяшчае непрадказальны ўзор ідэй і вынаходак – працы як дызайнера, так і навукоўца».

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы «The New York Times», novostiliteratury.ru, englishpen.org, «Rédaction Culture France Télévisions», «Wyborcza» і telegraf.com.ua.

Міжнародная дублінская літпрэмія

Эмілі Раскавіч атрымала Міжнародную дублінскую літаратурную прэмію 2019 года (раней вядомую як IMPAC) за раман «Айдаха».



Узнагарода складае 100 тысяч еўра, што робіць яе найбуйнейшай у свеце прэміяй за твор, выдадзены на англійскай мове.

Кнігі, уключаныя ў доўгі спіс Міжнароднай дублінскай літаратурнай прэміі, намінуюцца публічнымі бібліятэкамі ў гарадах па ўсім свеце. Паводле інфармацыі газеты «The Guardian», «Айдаха» быў намінаваны бібліятэчным філіялам у бельгійскім Бругe і абраны на літаратурную ўзнагароду са 141 прэтэндэнта.

«The Guardian» працытаваў Эмілі Раскавіч: «Гэта такая шакавальная сума грошай для выйгрышу! Я не магу паверыць, што ёсць такі прыз за адзін раман. Я не ведаю дакладна, што буду рабіць з гэтым, але я адчуваю, што цяпер магу рабіць выбар, які сапраўды прынясе карысць маёй творчасці. Гэта быў самы вялікі гонар у маім жыцці: мець кнігу і мець чытачоў».

Брытанская літпрэмія PEN Pinter Prize

Пераможцам брытанскай літаратурнай прэміі PEN Pinter Prize-2019 стаў брытанскі пісьменнік Лемн Сісей. Ён атрымае ўзнагароду на цырымоніі ў Брытанскай бібліятэцы 10 кастрычніка.



Лемн Сісей нарадзіўся ў 1967 годзе ў Англіі. Паколькі яго мама была вымушаная скончыць вучобу, сацыяльныя работнікі ўладкавалі нованароджанага малога ў прыёмную сям'ю, даўшы яму іншае імя — Норман. Гэтыя падзеі адлюстраваныя ў п'есе Сісея «Нешта цёмнае».

У сваіх творах Лемн Сісей узняў праблемы адзіноты, фізічнага гвалту і псіхалагічнага пераследу.

«У кожным сваім тэксце Лемн Сісей вяртаецца ў свет маргіналаў, у якім ён жыў як пакінутае дзіця. Са сваіх пакутаў ён выкоўвае прыгожыя словы і тысячы прычынаў жыць і кахаць», — заявіла адна з сяброваў журы прэміі пісьменніца Морын Фрылі.

Прыёмныя бацькі далі хлопчыку сваё прозвішча ды імя ў гонар евангеліста Марка. Ён заставаўся жыць у гэтай сям'і да 12 гадоў, потым яго аддалі ў дзіцячы дом. З 17-гадовага ўзросту Сісей вырашыў знайсці сваю маму і вярнуць сабе сапраўднае імя. У рэшце рэшт, яму ўдалося адшукаць маці, калі яму быў 21 год. На той час маці пісьменніка працавала ў структуры ААН у Гамбіі.

The PEN Pinter Prize — штогадовая літаратурная прэмія, заснаваная ў 2009 годзе англійскім ПЭН-клубам у гонар лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Гаральда Пінтэра. Гаральд Пінтэр быў віцэ-прэзідэнтам англійскага ПЭН-клуба і актыўным членам Камітэта зняволеных пісьменнікаў Міжнароднага PEN (WiPC).

Прэміяй, як правіла, узнагароджваюць брытанскага пісьменніка за выдатныя літаратурныя заслугі. Па словах Пінтэра, пераможца літаратурнай прэміі характарызуецца «рашучым, непахісным поглядам на свет» і дэманструе «жорсткую, інтэлектуальную рашучасць вызначыць сапраўдную ісціну нашага жыцця і нашага грамадства».

Прэмія Пушкінскага дома

Паводле паведамлення, апублікаванага на сайце Пушкінскага дома, лаўрэатам VII-га сезона прэміі Puskin House Russian Book Prize-2019 за лепшую кнігу пра Расію на англійскай мове ў жанры нон-фікшн стаў гісторык з Гарвардскага ўніверсітэта Сяргей Плохій.

Гарвардскі гісторык перамог з кнігай «Чарнобыль: Гісторыя трагедыі». Яго праца, апублікаваная Аленам Лэйнам, была адабраная групай з пяці суддзяў са спісу шасці фіналістаў — годных прэтэндэнтаў, творы якіх ахоплівалі гісторыю і культуру Расіі, а таксама мемуары.

Кніга С. Плохія стала першым усебаковым даследаваннем чарнобыльскай катастрофы 1986 года, працуючы над якім С. Плохій выкарыстаў мноства да гэтага ніколі не публікаваных матэрыялаў. Героі яго кнігі — людзі, якія спрабавалі прадухіліць аварыю, ліквідатары, навукоўцы, салдаты ды інжынеры, якія працавалі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі пасля аварыі.

С. Плохій ужо двойчы становіцца ўладальнікам прэміі Пушкінскага дома: чатыры гады таму яго ўзнагародзілі за кнігу «Апошняя імперыя».

Незалежны цэнтр рускай культуры ў Лондане Пушкінскі дом з 2013 года штогод прысуджае прэмію Pushkin House Russian Book Prize ў памеры 5 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Мэта прэміі — садзейнічанне разуменню Расіі і рускамоўнага свету і падтрымка інтэлектуальных дэбатаў у гэтай сферы. Літаратурную ўзнагароду прысуджаюць аўтарам кніг, якія напісаны па-англійску, але таксама разглядаюцца і пераклады з іншых моў.

Савецка-канадска-амерыканскі гісторык Сяргей Плохій з'яўляецца спецыялістам па гісторыі Усходняй Еўропы. Ён нарадзіўся ў Горкім (цяпер Ніжні Ноўгарад), у пачатку 1990-х гадоў пераехаў у Канаду, затым у ЗША. Цяпер займае пасаду прафесара гісторыі ў Гарвардскім універсітэце.

Французская літпрэмія Жана д'Ормесана

Вядомы брытанскі пісьменнік Джуліян Барнс ўганараваны французскай літаратурнай прэміяй Жана д'Ормесана за раман «La seule histoire» («Адзіная гісторыя»). Гэта раман пра шнары, якія пакідае на сэрцы першае каханне.



73-гадовы раманіст, усё яшчэ вельмі засмучаны смерцю сваёй жонкі і літаратурнага агента Пэт Кавана ў 2008 годзе, напісаў: «Першае каханне вызначае жыццё назаўсёды: гэта тое, што я выявіў за гэтыя гады; яно не абавязкова стаіць вышэй, чым наступнае каханне, але тое заўсёды будзе залежаць ад яго існавання».

Кніга Джуліяна Барнса, перакладзеная з англійскай Жанам-П'ерам Аўстэнам і апублікаваная выдавецтвам «Mercure de France» у мінулым кастрычніку, сведчыць аб тым, што «лепш пакутаваць ад кахання, чым не кахаць» (менавіта так рэзюмавала рэдактар Элаіза д'Ормесан, дачка акадэміка і стваральніца прэміі.

«Майму бацьку падабаўся дух Джуліяна Барнса, — працытавала Элаізу д'Ормесан «Agence France-Presse». — Двое мужчын падзялялі адну і тую ж жарсць да Гюстава Флабера». І дадала: ««Адзіная гісторыя» можа быць прачытана як сентыментальнае выхаванне маладога брытанца».

Прэмія Жана д'Ормесана, створаная ў мінулым годзе, з'яўляецца адной з самых арыгінальных літаратурных узнагарод. На яе прэзентацыі Элаіза д'Ормесан папярэдзіла: «Ні час, ні мова, ні пол не будуць перашкаджаць выбару дванаццаці прысяжных, толькі іх густы, іх саўдзел і пэўная форма выбарчай блізкасці будуць вызначаць іх выбар».

Пераможцам першай прэміі Жана д'Ормесана ў мінулым годзе стаў пісьменнік Жак Стывен Алексіс, «метэор гаіцянскіх пісьмаў» і ваяўнічы камуніст, забіты, верагодна, паслугачамі дыктатара Франсуа Дзювалье ў красавіку 1961 года ва ўзросце 39 гадоў.

Прэмія імя Шымборскай

Сёлета прэмія імя Віславы Шымборскай (лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі па літаратуры 1996 года) дасталася паэтцы Марце Падгурнік, якая жыве ў Глівіцах.

Літаратурную ўзнагароду яна атрымала за кнігу вершаў «Mordercze ballady», выпушчаную ў выдавецтве «Biuro Literackie».

Як паведамілі арганізатары прэміі, на адзін з самых прэстыжных конкурсаў паэзіі было прадстаўлена каля 200 паэтычных зборнікаў. У фінал выйшлі пяць кніг вершаў: «Навігацыя» Марзаны Багумілы Келы, «Смяротныя балады» Марты Падгурнік, «Паэмы супраць чалавецтва» Камілы Яняк, «Сабачая кніга» Пётры Яніцкага і «Полька» Роберта Круля.

Журы прэміі, у складзе якога былі Андрэй Чадановіч, Кароль Малішэўскі, Аліна Свецяк, Войцэх Лігеза, Ксавер Фарэ, Антонія Лойд-Джонс, Дарота Вальчак-Дэлані і сакратар прэміі Паўліна Малохлеб, абвесціла свой вердыкт падчас урачыстасці ў Кракаве.

Марта Падгурнік нарадзілася ў 1979 годзе ў польскай Сасноўцы. Яна — паэтэса, літаратурны крытык і рэдактар. У 2012 годзе за кнігу «Rezydencja surykatek» была ўганаравана літаратурнай прэміяй Гдыні. На конкурс прэміі імя Віславы Шымборскай яе кнігі намінаваліся тройчы: у 2016, 2018 і 2019 гадах.

Пераможцу паэтычнай прэміі чакае грашовы прыз у 100 тысяч злотых.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by